ВЫВУЧЭННЕ МОВЫ: НОВЫ ПАДЫХОД 4

ФРАНТАВЫЯ КАНЦЭРТЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. АЎТОРАК № 199 (29821)

## КАРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка 11—14 кастрычніка здзейсніць візіты ў Таджыкістан і Казахстан.

• **«Дзяржфармнагляд» адкрыў гарачую тэлефонную лінію па пытаннях цэн на лекі. Яна працуе па нумары +375 17 271-20-34.**

• Вучэнне АДКБ «Рубеж-2022» пачалося ў Таджыкістане. Актыўная фаза вучэння адбудзецца на палігоне Харбмайдон з 17 да 21 кастрычніка.

• **Беларус Павел Козін стаў уладальнікам Гран-пры конкурсу моды ў Санкт-Пецярбургу.**

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Андрэй ЛАБОВІЧ, намеснік старшыні Камітэта дзяржкантролю:**

*«Ва ўсіх рэгіёнах краіны працуюць мабільныя групы. Мы сёння выяўляем асобныя факты парушэння росту цэн адносна 6 кастрычніка. За суботу, нядзелю маніторынгу было падвергнута больш як 500 гандлёвых аб'ектаў. Пры гэтым выяўлены факты парушэння цэн: у Мінскім раёне ў двух аб'ектах — на хлебабулачныя вырабы, мяса-малочную прадукцыю, у Гомелі ў прыватным гандлёвым прадпрыемстве выяўлены факт завышэння цаны на хлебабулачныя вырабы, у трох суб'ектах гаспадарання Магілёва завышаны гранічныя гандлёвыя надбаўкі, у Гродзенскай вобласці ў чатырох суб'ектах гаспадарання таксама выяўлена завышэнне на мяса-малочную прадукцыю. Цяпер па ўсіх фактах завышэння цэн даецца прававая ацэнка для наступнага прыняцця рашэння аб пачатку крымінальных спраў».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ, І МЫ, ВАЕННЫЯ, ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ, КАБ ЯЕ НЕ БЫЛО»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях бяспекі. Яе мэта — абмеркаванне дадатковых мер, якія трэба прыняць для ўмацавання бяспекі нашай дзяржавы з улікам абстаноўкі, якая хутка мяняецца. Прэзідэнт нагадаў, што аб правядзенні гэтай нарады дамовіліся на сустрэчы з ваеннымі ў Цэнтры стратэгічнага кіравання Міністэрства абароны на мінулым тыдні.**

Фота БелТА.

### «Хай толькі дакрануцца брудnымі рукамі да нашай зямлі»

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сітуацыя вакол Беларусі застаецца напружанай. Па яго словах, на Захадзе насаджаецца меркаванне аб тым, што беларуская армія ўступіць у спецыяльную ваенную аперацыю на тэрыторыі Украіны непасрэдна. «Паддаўшыся гэтым укідам, ваенна-палітычнае кіраўніцтва Паўночнаатлантычнага альянсу і шэрагу Еўрапейскіх краін ужо адкрыта разглядае варыянты магчымай агрэсіі супраць нашай краіны аж да нанясення ядзернага ўдару. ***Для нас гэта не навіна, я вас папярэджваў даўно, што іх мэта не ў тым, каб мы не ваявалі на баку Расіі ва Украіне, каб, не дай бог, ядзерны ўдар не нанеслі. Не гэта галоўнае. Галоўная мэта застаецца ўцягнуць нас у вайну і заадно разабрацца з Расіяй і Беларуссю.*** Я вас аб гэтым папярэджваў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнт расказаў, што па неафіцыйных каналах паперадзілі аб нанясенні ўдараў па Беларусі з тэрыторыі Украіны. «Як было заяўлена: «мы зробім так, што гэта будзе Крымскі мост-2». Да мяне была неадкладна даведзена гэтая інфармацыя. ***Мой адказ быў просты: давядзіце Прэзідэнту Украіны і іншым вар'ятам, што Крымскі мост ім здасца кветачкамі, калі яны толькі дакрануцца сваімі брудnымі рукамі хоць да аднаго метра нашай тэрыторыі»,*** — расказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта функцыя ваенных і яны могуць лічыць гэта загадам Прэзідэнта: ***«Не дай бог, хтосьці з іх адважыцца тузануцца ў напрамку Беларусі. Бачыце, Крымскі мост закружыў галаву некаторым, у тым ліку і ваенным. Думаю, трэба астыць», — сказаў беларускі лідар.***

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Польшча «ну проста трымціць», просіць амерыканцаў, каб яны неадкладна завезлі ядзерную зброю і размясцілі на яе тэрыторыі, у тым ліку і з ядзерных арсеналаў Германіі. Па яго словах, нядаўна было выяўлена, што палякі, ахоўваючы граніцу з Беларуссю, прыцягвалі ўзброеныя сілы. «Так, потым яны ўзброеныя сілы ад граніцы адвялі. Часткова, але паказалі нам, што яны сыходзяць. Нічога падобнага. Яны адвялі да сотні кіламетраў войскі ад граніцы, насычаюць іх зброяй натаўскіх узораў. Усё савецкае і што ў іх было польскае, яны сплавілі ва Украіну, утылізавалі. А пераўзбройваюць самай сучаснай зброяй. І што такое назад падысці да граніцы Беларусі — паўночы, і яны будуць там», — расказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ўсё гэта бачаць і гэта не павінна заспакойваць. Па яго словах, калі трэба, у «момант чэ» палякі перакінуць свае войскі на працягу двух-трох гадзін на граніцу, на тыя пазіцыі, дзе яны павінны знаходзіцца.

СТАР. 2

Галіна і Уладзімір каля выратаванай імі крыніцы.

Сямейныя гісторыі

# КАМОДА НА ПАСАГ

## Сям'я Патарыкіных захоўвае спадчыну продкаў, даглядае крыніцу і клапоціцца пра памятныя месцы

**Галіна разам з мужам Уладзімірам жыве ў Светлагорску, але кожны год яны прыязджаюць у Бялыніцкі раён на ўсё лета. А заадно прывозяць старэнькую Галініну маці, якая вельмі сумуе ў горадзе па роднай хаце. Тут сапраўды вельмі прыгожа. Шмат зеляніны, возера за пералескам, крынічка за агародам. Утульнае радавое гняздо. І дарагія сэрцу продкі дагэтуль жывуць тут: у фотаздымках, ручніках, самаробнай мэблі. У кожнай рэчы свая гісторыя. Узяць, напрыклад, камоду. Лічы, сямейны талісман. Без яго, магчыма, лёс паважанай Варвары Герасімаўны, Галінінай бабулі, склаўся б па-іншаму. І не сядзелі б мы тут на верандзе са смачным пірагом і духмянай кавай, успамінаючы цёплыя сямейныя гісторыі. Але ж аб усім па парадку.**

СТАР. 5

# «НЕ ПАВІННА БЫЦЬ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ, І МЫ, ВАЕННЫЯ, ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ, КАБ ЯЕ НЕ БЫЛО»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне, дадзенае на мінулым тыдні. Праінфармаваць насельніцтва, ваенных, журналістаў, дзяржаўных служачых аб сітуацыі, якая складваецца вакол Беларусі. «У адваротным выпадку будзе сітуацыя як у 2020 годзе: мы тут усё ведаем, быццам разумеем, а народ гэтага не ведае. Трэба інфармаваць. Я ведаю, што такія інфармацыйныя нарады адбыліся. ***Не спрашчаючыся, мы правядзём інфармаванне ўсяго насельніцтва нашай Беларусі, асабліва буйных прадпрыемстваў, на самым высокім узроўні»,*** — растлумачыў ён.

## Крыніц незадаволенасці людзей быць не павінна

Аляксандр Лукашэнка згадаў нараду з экамічным блокам урада, якая таксама адбылася на мінулым тыдні. Па выніках той нарады, па распараджэнні Прэзідэнта ўведзена забарона на бескантрольнае павышэнне цэн. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што галоўная мэта той нарады і падобных нарад — зняць пункты напругі і незадаволенасці людзей. «Мы бачым па сацыялагічных пытаннях, што рост цэн, інфляцыя ў краіне ўжо на другім месцы сярод пытанняў, якія непакояць нашых людзей. ***У аснове нашай палітыкі ляжала канцэпцыя справядлівасці, мы яе будзем прытрымлівацца і надалей. Галоўнае не забарона на рост цэн. Не забарона. Галоўнае — гэта выпрацоўка сістэмы кантролю за цэнаўтварэннем. А да выпрацоўкі гэтай сістэмы гэта некалькі дзён, цэны расці не павінны»,*** — растлумачыў ён.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што гэтыя дні дэпутаты, прафсаюзы, Камітэт дзяржкантролю кантралявалі выкананне даручэння Прэзідэнта. Толькі ў дзясятку з тысяч праверэных аб'ектаў выявілі невялікі рост цэн. Па ўсіх фактах узбуджаны крымінальныя справы.

«Калі мы баімся, што наступіць нейкі дэфіцыт з-за таго, што мы заціснулі цэны па некаторых групах тавараў, то губернатары і міністры прымуць адпаведныя рашэнні. Яны за гэта будуць адказваць. Сёння за гэта практычна ніхто не адказвае, адказвае яго вялікасць рынак. Але што такое рынак, мы ведаем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што нас увесь час штурхалі ў бездань рынкавых адносін — гэта значыць, вэрхал, бардак ды іншая блытаніна». «Бачу, што ў нас пераважная большасць спецыялістаў паддаліся вось гэтым рэчам. Рынкавае цэнаўтварэнне. Нідзе яго не было, няма і не будзе. Яшчэ раз падкрэсліваю, звяртаючы ўвагу на цэнаўтварэнне. Гэта крыніца незадаволенасці людзей. І гэтых крыніц быць не павінна», — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на праблему з дармаедамі ў краіне. Ён расказаў, што зараз выпрацоўваюцца адпаведныя меры для вырашэння гэтай праблемы.

«Правільна сказаў старшыня прафсаюзаў Міхаіл Сяргеевіч Орда. Некалькі тысяч не працуюць, а сацыяльныя паслугі, у тым ліку адукацыі і аховы здароўя, яны атрымліваюць. Гэта справядліва? Несправядліва», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што ўсялякія пасярэднікі на рэалізацыю беларускай прадукцыі павінны быць прыбранья. Работа павінна ісці толькі наўпрост. Цэны павінны ўстанаўлівацца і на імпартную прадукцыю. «Мы будзем правяраць, адкуль тут у 5—10 разоў выраслі цэны. Калі гэта абгрунтавана — Бог з вамі. Калі не — лічыць мы добра ўмеем, адказваць вы будзеце па Крымінальным кодэксе», — сказаў ён.

Што да экспарту. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў МТЗ, МАЗ, БелАЗ і іншых прадпрыемствах таксама з'явіліся пасярэднікі. Ён адразу параіў усім кіраўнікам прадпрыемстваў і буйных, і дробных, і прыватных і дзяржаўных: дылерамі павінны быць самі прадпрыемствы. «Сваю прадукцыю на рынках вы павінны прадаваць самі. Калі вы камусьці з прыватнікаў дазволіце прадаваць — няхай міністр зацвердзіць гэтае рашэнне», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Рост цэн, дармаеды — гэта ўсё кропкі напругі, якіх, па словах Прэзідэнта, у краіне нямала. Але ён канстатаваў, што ў найбліжэйшы час з імі разбяруцца. «Мэта адна — толькі справядлівасць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## Без перабору і нагнятання

Кіраўнік дзяржавы расказаў: у гэтых умовах Злучаныя Штаты Амерыкі і Еўрасаюз заяўляюць, што будуць легалізаваць нашых «збеглых», як палітычную сілу, намерваюцца істотна нарасціць падтрымку дэструктыўных элементаў, абвастрыць абстаноўку на заходняй мяжы аж да адкрыцця «другога фронту». «Памятаеце, я вас папярэджваў, яшчэ ў пачатку гэтай спецыяльнай ваеннай аперацыі, калі я казаў, што мы не дазволім страляць у спіну рускім. Гэта тады было вобразна сказана. Але я тады бачыў, што ***нам самы небяспечны напрамак — заходні. І калі б мы яго агалілі, мы б сёння стаялі на парозе вайны. Але мы пакінулі там Узброеныя Сілы, не ўпусцілі заходні напрамак»,*** — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён прывёў у прыклад падзеі 2020 года, калі калектыўны Захад спрабаваў здзейсніць бліцкрыг у Беларусі, пачаўшы з «каляровай рэвалюцыі» і мецяжу. Не атрымалася. Другі этап — эканамічнае ўдушэнне і інфармацыйны ціск на Беларусь. Санкцыі не спрацавалі. Значыць, і эканамічна задушыць нас не змаглі. Прэзідэнт адзначыў, што застаецца адзіны спосаб — сілавое вырашэнне пытання праз дыверсіі, правакацыі, што прывядзе да дэстабілізацыі абстаноўкі ў нашай краіне, гэта іх план.

«Ва Украіне сёння не проста абмяркоўваецца, а плануецца нанясенне ўдару па тэрыторыі Беларусі. Вядома, украінцам гэта не патрэбна. Навошта ім адкрываць другі фронт на нашых паўднёвых межах, у іх на паўночных. Ну навошта? Гэта вар'яцтва з пункту гледжання ваенных. Але тым не менш працэс пайшоў. ***Іх штурхаюць гаспадары да развязвання вайны супраць Беларусі, каб нас туды ўцягнуць. Яшчэ раз паўтараю, каб разабрацца з Расіяй і заадно з Беларуссю. Мы гэта бачылі даўно. Я аб тым папярэджваў не толькі нашу грамадскасць, але і ўсю сусветную супольнасць»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, гэта бачылі і ведалі. Былі створаны батальна-тактычныя групы, адпрацоўваецца абарона паўднёвых граніц. Там на пастаяннай аснове дзяжураць нашы Узброеныя Сілы.

«Падзеі з Крымскім мостам гавораць аб значным павышэнні ўзроўню тэрарыстычнай пагрозы. Яны гатовы зараз ваяваць з усімі. На гэтым фоне падрыхтоўка ў Польшчы, Літве і Украіне баевікоў з ліку беларускіх радыкалаў для правядзення дыверсій, тэрактаў і арганізацыі ваеннага мецяжу ў нашай краіне набывае ўзровень непасрэднай пагрозы. Улічваючы жаданні кіраўніцтва Польшчы пабразгаць нават ядзернай зброяй, гэта ўжо не пагроза — гэта небяспека абароназдольнасці нашай краіны. ***Я не хаваю, яшчэ некалькі дзён таму КДБ даручана правесці неабходныя мерапрыемствы контртэрарыстычнага характару»,*** — расказаў Прэзідэнт. Па яго словах, улічваючы ўсе гэтыя фактары і ў цэлым існуючую абстаноўку, неабходна мець варыянты процідзеяння, у тым ліку і ваеннага, каб своечасова выявіць і лакалізаваць пагрозы. А ў выпадку неабходнасці — адэкватна адказаць на любыя ваенныя праявы супраць Беларусі.

Беларускі лідар нагадаў, што пасля неафіцыйнага саміту СНД у яго адбылася сустрэча сам-насам з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў сувязі з абвастрэннем сітуацыі на заходняй граніцы Саюзнай дзяржавы разам з расійскім калегам яны дамовіліся аб разгортванні рэгіянальнай групоўкі войскаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. «Гэта ўсё паводле нашых дакументаў. Калі ўзровень пагрозы дасягае цяперашняга ўзроўню, як зараз, мы пачынаем задзейнічаць групоўку Саюзнай дзяржавы. Аснова гэтай групоўкі — армія, Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне гэтай групоўкі пачалося», — сказаў ён. Прэзідэнт звярнуў увагу, што Расіі зараз не да гэтага канфлікту, таму не варта разлічваць на вялікую колькасць Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Але гэта будзе не адна тысяча людзей. Аляксандр Лукашэнка даручыў міністру абароны Віктару Хрэніну прыняць гэтых людзей і размясціць іх, дзе трэба «без перабору і нагнятання».

Таксама Прэзідэнт расказаў, што даручыў Міністэрству абароны і Камітэту дзяржбяспекі прапрацаваць магчымы комплекс мер па кантролі за сітуацыяй і рэагаванні на яе. «Яшчэ раз папярэджваю. ***Мы дастойна адкажам любому праціўніку. Мы да гэтага рыхтаваліся не адзін дзясятак гадоў. Калі трэба будзе — мы адкажам, — не дай бог, вядома»,*** — заявіў ён. Таму, па словах Галоўнакамандуючага, неабходна ведаць усё, што адбываецца каля нашых граніц.

***«Не нагнятаючы абстаноўку, хачу, каб вы разумелі: хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Заўсёды. Усё жыццё. Таму, каб не дапусціць усякіх сутыкненняў і праяў, мы, людзі ваенныя, павінны мець загадзя планы процідзеяння рознага кшталту мярзотнікам, якія спрабуюць нас уцягнуць у бойку. Мы не павінны ім дазволіць уцягнуць нас у вайну. Гэта нашая галоўная задача. Не павінна быць вайны на тэрыторыі Беларусі, і мы, ваенныя, павінны прыняць усе меры, каб яе не было»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што людзі нутром адчулі напружанне. Ён параіў кожнаму на сваім месцы займацца сваёй справай. ***«Сітуацыя сёння не настолькі абвостраная, каб мы ўжо пачалі нешта рабіць.*** Для гэтага ёсць ваенныя, якія на гэтым этапе прадэманструюць сваю рашучасць бараніць краіну. І тады ніводзін мярзотнік сюды не сунецца», — канстатаваў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ У тэму

**Віктар ХРЭНІН:**

### «НІ З ЛІТОЎЦАМІ, НІ З ПАЛЯКАМІ, НІ ТЫМ БОЛЬШ З УКРАІНЦАМІ МЫ ВАЯВАЦЬ НЕ ХОЧАМ»

Міністр абароны Віктар Хрэнін заявіў, што Узброеныя Сілы Беларусі зробяць усё, каб гарантаваць бяспеку краіны. «Мы фіксуем: нашы суседзі (украінцы) заклапаціліся сёння тым, што з боку Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь могуць ажыццяўляцца агрэсіўныя дзеянні. Гаворка ідзе аб працягу ўкідвання інфармацыі аб нібыта рыхтаваным нападзе з нашага боку. У нас адказ на гэта быў і застаецца адзін: не правакуйце нас, мы з вамі ваяваць не збіраемся. Ні з літоўцамі, ні з палякамі, ні тым больш з украінцамі мы ваяваць не хочам. Калі і вы не хочаце і не будзеце рабіць няправільныя крокі, значыць, вайны не будзе», — сказаў Віктар Хрэнін. Міністр падкрэсліў, што нашы планы — гэта планы абароны. На выпадак, калі нападаць будуць на нас. «Калі хоць адзін метр беларускай зямлі будзе падвергнуты агрэсіі, як было сказана Галоўнакамандуючым, адказ будзе імгненны і жорсткі. Таму мы яшчэ раз перасцерагаем ад правакацый. Вы не хочаце з намі вайны — мы не хочам яе таксама. Для беларусаў хачу сказаць словамі Галоўнакамандуючага: сітуацыя сёння не настолькі абвостраная, каб панікаваць. Кожны сёння на сваім месцы павінен спакойна займацца сваёй справай. Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь зробяць усё, каб гарантаваць бяспеку», — канстатаваў міністр абароны.

Акцыя «Сімвал адзінства»

## Лічбавы код каля стэлы Машэрава

**Удзельнікі акцыі «Сімвал адзінства», арганізаванай рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Патрыёты Беларусі» пры падтрымцы Федэрацыі прафсаюзаў, наведалі Брэст. Такім чынам, акцыя, якая прайшла па ўсіх гарадах Беларусі, завяршылася.**

З боку Мінска да Брэсцкай крэпасці ў складзе аўтапрабегу праехала больш за 150 машын. Да гэтага ўдзельнікі акцыі пабывалі ва ўсіх раённых цэнтрах Брэстчыны, наведалі памятныя мясціны, усклалі кветкі, ушанавалі хвілінай маўчання памяць абаронцаў Радзімы і ахвяр вайны.

У Брэсцкай крэпасці адбыўся мітынг. Пасля яго ўсе накіраваліся да алеі пад назвай «Іх імёнамі названыя вуліцы Брэста». Тут адбылася ўрачыстая ўстаноўка шыльдачак з лічбавым QR-кодам каля стэлы ў гонар Пятра Машэрава. Яны неўзабаве з'явяцца каля кожнай стэлы на алеі.

**Яна СВЕТАВА.**
**Фота з тэлеграм-канала Аляксандра РАГАЧУКА.**

Права на дапамогу

## НАТАРЫУС ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ

**Бясплатную юрыдычную кансультацыю з нагоды Дня маці (14 кастрычніка) і Дня бацькі (21 кастрычніка) усім шматдзетным і сем'ям, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, дораць беларускія натарыусы 14 кастрычніка.**

Усе натарыяльныя канторы і бюро Беларусі будуць працаваць згодна са сваім звычайным раскладам, убачыць які можна на сайце Беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by ў раздзеле «Знайсці натарыуса». Падчас сустрэч са спецыялістамі бацькі змогуць атрымаць адказы на пытанні, што ўваходзяць у кампетэнцыю натарыусаў, у прыватнасці: даведацца пра афармленне спадчынных правоў, складанне завяшчанняў і адчужэнне маёмасці.

Правядзенне ў межах прававой адукацыі падобных акцый, прымеркаваных да дзяржаўных свят і іншых дат, даўно стала традыцыйным і садзейнічае ўмацаванню абароны правоў і законных інтарэсаў беларусаў, запэўнілі ў Беларускай натарыяльнай палаце.

**Ірына СІДАРОК.**

Гарадское асяроддзе

# ЧАЦВЁРТЫ ПАЙШОЎ...

## У Гродне самы заходні мост праз Нёман на паўгода закрыты на рамонт

**Паповіцкі, ці Новы, мост завершыць тэму аднаўлення чатырох мастоў у абласным цэнтры. Сёлета пасля рамонту пачаў дзейнічаць Румлёўскі мост, у мінулым годзе адбылося ўрачыстае адкрыццё Усходняга моста, у 2008-м завершана маштабная рэканструкцыя Старога моста ў гістарычнай частцы горада. Падрыхтоўчыя работы і ход будаўніцтва — на кантролі старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КАРАНІКА.**



Вуліца Паповіча дала назву і самаму заходняму мосту ў Гродне. Праўда, на пачатку 1970-х гадоў, калі аб'ект уступіў у строй, яго называлі Новым. Але з таго часу прайшло больш за паўстагоддзя, і Новы мост часцей называюць Паповіцкім. Яго будаўніцтва цесна звязана з развіццём заходняй часткі горада.

Як расказаў Уладзімір Каранік, мост ні разу капітальна не рамантаваўся, хоць яго абследаванне праводзіцца рэгулярна. Прычым з кожным разам сітуацыя па яго стане пагаршалася. Па выніках апошняга абследавання эксплуатацыя моста дазволена да канца снежня.

Гэта значыць, што ў любым выпадку мост з будучага года павінен закрыцца для транспартнага руху. Каб не дапусціць прастою, было прынята рашэнне аб яго аднаўленні. Такім чынам, работы будуць весціся ў асенне-зімовы і вясновы перыяды. Паведамлялася, што раней прыступіць да рамонту не было магчымасці, бо ішлі работы на Румлёўскім месце. Закрыццё адразу двух мастоў прывяло б да транспартнага калапсу, патлумачыў старшыня аблвыканкама. Да таго ж сучасныя тэхналогіі дазваляюць выканаць увесь аб'ём работ незалежна ад надвор'я.

Падчас дэталёвага абследавання моста па вуліцы Паповіча быў выяўлены знос некаторых канструкцый, карозія жалезных элементаў, невялікія расколіны. Для больш дакладнага «дыягназу» быў зняты верхні пласт асфальту. Стаяла пытанне: альбо поўнасцю мяняць маставыя бэлькі, альбо іх узмацніць. Першы варыянт патрабуе поўнай разборкі моста і працяглых работ па акваторыі Нёмана. Другі не такі радыкальны як па аб'ёме, так і па тэрмінах. Яго і абралі.

— Папярэднія разлікі паказалі, што мост яшчэ можна адрамантаваць без замены бэлек. Гэта значна паскорыць працэс рамонту. Такі шлях найбольш аптымальны, — зазначыў Уладзімір Каранік. — Работы на месце пачаліся і ўступаюць у актыўную фазу. Гэта зойме пяць месяцаў, і ў маі будучага года рамонт плануецца завяршыць. Тэрмін наступнай эксплуатацыі гарантуецца на працягу 25 гадоў. Гэта не азначае, што праз 25 гадоў мы павінны яго разабраць і пабудаваць новы. Даследаванні могуць паказаць, што яго эксплуатацыя можна быць працягнута яшчэ на 10 гадоў.

Праект уключае не толькі рамонт, але і добраўпарадкаванне і азеляненне пад'ездаў, асвятленне тэрыторыі. Праектная дакументацыя будзе выдавацца раздзеламі і адразу ўключацца ў работу з паралельным праходжаннем дзяржаўнай экспертызы.

Зразумела, што рух на месце поўнасцю спынены. Спецыялістамі прапрацоўваюцца новыя маршруты грамадскага транспарту. Дадзены рэкамендацыі, як пераразмеркаваць патокі машын па кожным мікраёне. Паралельна з рамонтам моста будзе прыведзены ў парадак і пуцепровад, і ўсе падыходы да моста.

Разглядаецца магчымасць арганізацыі пешага руху па пантонным месце праз Нёман у выпадку поўнага закрыцця пуцепровада па вуліцы Паповіча. Месца для пантоннага моста ўжо вызначана. Ён можа быць устаноўлены ніжэй па цячэнні за 50 метраў ад аб'екта рамонту.

Па словах кіраўніка рэгіёна, з гэтага тыдня будуць вывучацца ўсе пытанні і прапановы гараджан па арганізацыі руху грамадскага транспарту. Уводзіцца гібкая сістэма рэагавання. Каб пашырыць магчымасці тралейбуснага дэпо, выдзелены сродкі для набыцця сямі тралейбусаў з аўтаномным ходам. Новы транспарт з'явіцца ўжо напрыканцы года, што дазволіць аператыўна мяняць маршруты.

Генеральным планам горада прадугледжана будаўніцтва яшчэ аднаго моста праз Нёман, праўда, толькі ў выглядзе праекта і без вызначэння канкрэтнага месца. Раней ішла гаворка аб пешым мосце ў раёне Пышкоў. Пытанне не знята з парадку дня, паведаміў губернатар, наадварот: пешы мост вырашылі замяніць паўнавартасным аўтамабільным. Ён павінен размясціцца паміж Старым мостам і Новым, які зараз праходзіць рэканструкцыю. Гэта будзе пяты па ліку гарадскі мост, які дазволіць разгрузіць катэджныя пасёлкі Ласосна і Баранавічы. Але ў гэтым выпадку трэба шукаць кампраміснае рашэнне, якое забяспечыла б інфраструктуру і не пашкодзіла зону адпачынку. Гэта тэма, запэўніў Уладзімір Каранік, будзе вырашацца не кулуарна, а праз грамадскае абмеркаванне. Па яго словах, цяпер у горадзе вядзецца работа па рамонце некалькіх буйных развязак, што дазволіць злучыць хуткаснай магістраллю Альшанку і Грандзічы — два мікрараёны, якія развіваюцца.

«У дарожную сетку зроблены рэкордныя капіталаўкладанні, і гэта будзе працягвацца, бо сучасная транспартная сетка — якасць жыцця нашых грамадзян», — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Па сутнасці

# ТРЫ ГАЛАВЫ АДНАГО ЦМОКА

У сучасным слэнгу ёсць такое паняцце: «Я — крычу». Бо ствараецца ўражанне, што цяпер усё можна. Мне здаецца, менавіта з прабіркі Коліна Паўэла (калі колішні дзяржсакратар ЗША на пасяджэнні Савета бяспекі ААН у лютым 2003-га абвінавачваў Ірак) і вырас «монстр Шваба» — тэорыя новых нармальнасцяў. Зараз усё можна?

Памятаеце Абаму на галоўнай Нобелеўскай сцэне — у шыкоўных апартаментах Осла падчас атрымання прэміі Міру. Там жа ў кулуарах клілі: «Маўляў, за што, ён жа толькі нядаўна стаў прэзідэнтам, яшчэ не паспеў захапіць ніводнай нафтаноснай краіны свету». Але тое быў пачатак. Пачатак канца ўсіх сапраўдных нобелеўскіх прынцыпаў.

Неспадзяванка атрымалася. Нашчадкі Нобеля сусветную і вельмі паважаную прэмію дэвальвавалі, ператварылі ў плюшку для барацьбітоў з уладамі. Дык варта б і назву прэміі змяніць. Так бы і назвалі: «неверагодная прэмія». Бо з чым наваспечаныя лаўрэаты змагаюцца? З падатковымі ведамствамі сваіх краін. Ды яшчэ са сваімі хаўруснікамі. Хто болей адхопіць сабе ў карман з тых еўрапейскіх данатаў.

«Мірную» нобелеўку сёлета атрымалі прадстаўнікі адразу трох краін — Беларусі, Расіі і Украіны. Дакладней пазначыць — апазіцыйныя дзеячы з нашых славянскіх краін. Атрымалася сапраўдная «славянская тройка». Але каго яна вязе, хто ёй кіруе, ды хто паганяе? Пад чыёй яна пугай? Украінскі цэнтр грамадскіх свабод, праваабаронцы «Мемарыяла» з Расіі і іх беларускія паплечнікі з «Вясны» — нават у часы «халоднай» вайны такіх міззорных дысідэнтаў не абіралі.

Сахараў, «бацька» першай савецкай вадароднай бомбы разам з Салжыніцыным у сваіх «развагах аб прагрэсе, мірным суіснаванні і інтэлектуальнай свабодзе» дагаварыліся да прэміі міру. Там хаця б было зерне гэтых мірных ініцыятыў. Ніколі ў спісе на прэмію міру няма апазіцыянераў з краіны з «дэмакратыяй заакіянскага разліву». Ці можа інстэблішмент у іх такі гасцінны і сціплы, што заўжды прапаноўваюць толькі праваабаронцаў з нашых краін. Альбо ў іх там зусім дэфіцыт на альтэрнатыўнае меркаванне.

На каго ж позірк паклалі гэтым разам? Знаёмцеся. Асобы гэтыя — не Сахараў і не Салжаніцын. Свет пра іх не чуў. Пачнём з жоўта-блакітнага цэнтра грамадскіх свабод. Гучыць абнадзейліва. Можа, лаўрэаты тыя дапамагалі людзям з Данбаса, змагаліся супраць турмаў СБУ альбо звярнулі ўвагу свету на пераживанні родзічаў, спаленых у Адэсе. Не, прынамсі ніхто аб гэтым не чуў. У сучаснай трактоўцы па-ўкраінску грамадскія свабоды — гэта жанчыны без сораму.

Цяпер аб «мемарыяле», што ў Расіі. З дзяцінства я прывык Мемарыялам лічыць: Брэсцкую крэпасць-герой, Хатынь, Мамаеў Курган... А пра што той новы мемарыял? (Дарэчы, літары «М» і «м» у гэтых сказах я паставіў калі не па «сінтаксічным фэн-шуі», затое па справядлівасці памяці). Бо гэты намінаваны «мемарыял» так нічога і не стварыў. Мэтай яго існавання ажно з 1987-га з'яўлялася жаданне ўвекавечыць памяць ахвяр палітычных рэпрэсій савецкай эпохі. Так, як гэта літаратурна зрабіў геній Салжыніцына, ніхто лепей ужо не зробіць... І вось што яшчэ цікава. Калі б пасядзеў той вядомы літаратар у сутарэннях Рэчы Паспалітай, напрыклад, і апісаў гэта. Ці атрымаў бы тады ён за свой, не менш таленавіты і магчымы раман «У кіпцюрах польскай дыфензівы» літаратурную «нобелеўку»?

Чаму не створаны такі «мемарыял» у ЗША, напрыклад, па ўвекавечанні памяці забітых індзейцаў? Чаму няма афрыканскіх «мемарыялаў». Колькі там загінула не ў гета, а на сваёй радзіме ад кольтаў ды бізуноў каланістаў-капіталістаў! Такі мемарыял можна стварыць і ў Бельгіі. На месцы чалавечых заапаркаў. У «адукаванай Еўропе» яны яшчэ існавалі, калі «таталітарны рэжым» адправіў у космас хлопца са шчырай усмешкай.

А што датычыцца «мемарыяла» ў Расіі, то яны не змаглі яго пабудаваць нават у гады «ельцыноідаў». Нават у той час, калі расійская глеба была асабліва ўрадлівай для ўсялякага іншаземнага пустазелля. Тады яны стваралі не помнікі — тады яны стваралі «пятую калону». А іншаземныя грошы на помнік ГУЛАГа, мабыць, скралі. Інагенты ёсць інагенты.

Шлях на палітычны алімп у Бяляцкага класічны для нашых «мемарыялістаў». Праз пагост Курапат «чарнобыльскім маршам» да спажывецкай піраміды беларускай апазіцыі. Такім чынам, «лаўрэат» нават свой прывабны бізнес прыдбаў. Праваабарончы цэнтр «Вясна». Афшор для еўрапейскіх данатаў. Памятаеце класічныя радкі: «Вясна, вясна! Не для мяне ты! Не я табою абагрэты». Не для беларусаў гэты праваабарончы цэнтр. А вось атрымаць паперку, званне ганаровага палітвязня — рэкамендацыю ў Польшчу — гэта калі ласка. Сярод спонсараў усялякіх гендарных мерапрыемстваў таксама нярэдка стаяла тая «Вясна». Не грэбавалі дапамагаць распаўсюджанню такога вось незвычайнага, неверагоднага гендарнага «істэблішменту». Вельмі ўжо «дэмакратычны», «неардынарны» падыход да жыцця, чужога жыцця і ў сына праваабаронцы. Ён каля Асвенціма здзейсніў паказальную інсталяцыю — зарэзаў барана.

Вось такія дзеці ў барацьбітоў за мір. Але ж, вядома, бацька за сына не адказвае. А за што адказвае нобелеўскі камітэт?..

Дарэчы, самых «мірных» лаўрэатаў павіншаваў кіраўнік самага ваяўнічага альянсу. Енс Столтэнберг адзначыў, што права казаць праўду ўладам з'яўляецца асновай любога свабоднага і адкрытага грамадства. Няўжо? Я не буду апавядаць аб антыгламбалістах, «жоўтых камізэльках», звычайных людзях, якіх «змывалі» брандсбойтамі і тапталі коньмі на вуліцах Еўропы. Пра тых, каго расстралялі ў «аплоце амерыканскай дэмакратыі». Заблакаваны «Твітэр» Трампа — гэта і ёсць асноўная любога «свабоднага і адкрытага грамадства».

Дзякуючы такому «суквеццю» барацьбітоў адразу разумела, што збіраў гэты нобелеўскі «восеньскі букет». Ясна як белы дзень: усе яны, гэтыя «траянскія коні» з аднаго «стойла». А калі звярнуцца да міфалогіі, то гэтае спалучэнне вельмі нагадвае трохгаловага цмока, які пыхае на нашы краіны. Але што ў рускім, што ў нашым беларускім фальклоры — галовы тыя будуць збітыя.

Ну, добра, няхай я ангажаваны. Давайце звернемся да першакрыніцы. Да запавету самога Альфрэда Нобеля. За што чалавека альбо групу асоб адзначаюць такой важкай прэміяй. З крытэрыямі знаёмімся ўважліва: «За ўклад у скарачэнне колькасці ўзброеных сіл, садзейнічанне мірным перагаворам і ўклад ва ўмацаванне брацкіх адносін паміж народамі». Я медыяэксперт, тэкст аздабляю вобразамі. Пад гэты запавет найлепшы відэазапіс — гэта «карцінка» з нашага Палаца Незалежнасці ў лютым 2015 года. Але ж не заўважылі і не пачулі. Ні тады, ні цяпер. Праігнаравалі і нашы мінскія ініцыятывы — чужыя для іх і нават свайго Нобеля.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Педсавет

# ЧЫТАЦЬ, АНАЛІЗАВАЦЬ, РАЗВАЖАЦЬ...

## Чаму ўменне працаваць з інфармацыяй — жыццёва неабходная кампетэнцыя?

**Ці можна навучыць дзяцей творчасці на школьных уроках, калі даваць ім стандартныя заданні? Якія тэндэнцыі павінны ўлічваць педагогі, што выкладаюць у школе беларускую мову і літаратуру? Ці можна захапіць сучасных дзяцей чытаннем? Што такое чытацкая адукаванасць? Да чаго рыхтавацца адзінаццацікласнікам, якім давядзецца ўпершыню здаваць беларускую мову на цэнтралізаваным экзамене? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў круглага стала, арганізаванага Нацыянальным інстытутам адукацыі ў рамках Тыдня роднай мовы. Далучыцца да дыскусіі маглі настаўнікі, выкладчыкі, студэнты, аспіранты і навукоўцы.**

### Новы фармат выпускнога экзамену

Як заўважыла **намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі па навукова-даследчай рабоце, доктар педагагічных навук, дацэнт Вольга ЗЕЛЯНКО,** новы навучальны год распачаўся з добрых навін: у 10 і 11 класах павялічылася колькасць гадзін на вывучэнне прадмету «Беларуская мова» і «Руская мова»: на базавым узроўні адведзена 53 гадзіны ў год замест 35. З улікам запланаванага на 2023 год цэнтралізаванага экзамену па адной з дзяржаўных моў у выпускнікоў будзе больш магчымасцяў падрыхтавацца да экзаменацыйнага выпрабавання на школьных уроках.

Але відавочна, што новы фармат уступнай кампаніі ўсіх трывожыць. Пытанні, як менавіта будуць праходзіць выпускныя экзамены за курс школы і ўступныя іспыты ў ВНУ, разглядаюцца сёння на найвышэйшым узроўні.

— На працягу другой паловы верасня амаль штодня праходзілі абмеркаванні з рэгіёнамі, высвятлялася пазіцыя педагагічнай грамадскасці адносна фармату экзаменацыйнай кампаніі. Абмяркоўвалася некалькі мадэляў, — паведаміла Вольга Зелянко. — Першая мадэль мае на ўвазе здачу двух цэнтралізаваных экзаменаў пасля заканчэння 11 класа, якія з'яўляюцца адначасова і выпускнымі экзаменамі, і ўступнымі іспытамі ў ВНУ: адзін з іх — па дзяржаўнай мове на выбар, другі — па матэматыцы. Балы, атрыманыя на цэнтралізаваным экзамене, будуць пераводзіцца па дзесяцібальнай шкале ў адзнаку, якая пойдзе ў атэстат. Далей вучань, які плануе працягнуць навучанне ў ВНУ, зможа здаць яшчэ некалькі прадметаў на ЦТ.

Другая мадэль — адзінаццацікласнікі здаюць два цэнтралізаваныя экзамены: першы па адной з дзяржаўных моў на выбар, а другі — неабавязкова матэматыка, гэта будзе адзін з профільных прадметаў для абранай спецыяльнасці. Дапусцім, калі выпускнік паступае ў медуніверсітэт, то ён можа здаваць на цэнтралізаваным экзамене біялогію ці хімію і прад'явіць у прыёмную камісію атрыманы на цэнтралізаваным экзамене сертыфікат. А другі профільны прадмет ён ужо будзе здаваць непасрэдна ў ВНУ экзаменацыйнай камісіі. Фармат экзамену будзе вызначацца самім універсітэтам. У другой мадэлі прадугледжваецца афармленне характарыстыкі на вучня, якая раскрывае выпускніка як асобу. Характарыстыку будзе зацвярджаць педагагічны савет установы адукацыі.

Абмяркоўвалася таксама і трэцяя мадэль. Выпускнік здае тры цэнтралізаваныя экзамены. Адзін — па дзяржаўнай мове і два — па выбары вучня. Напрыклад, гэта могуць быць беларуская ці руская мова, хімія і біялогія пры паступленні на медыцынскія спецыяльнасці.

Сёння ў Міністэрстве адукацыі аналізуюць інфармацыю, атрыманую з розных дыялогавых пляцовак, вывучаюць меркаванні настаўнікаў, кіраўнікоў школ, спецыялістаў ВНУ. З упэўненасцю можна сцвярджаць адно: цэнтралізаванаму экзамену па беларускай (рускай) мове ў фармаце тэставай работы быць! Тэст будзе ўтрымліваць частку А і частку В. Колькасць заданняў адкрытага тыпу, дзе навучэнец павінен даць кароткі адказ, а не выбраць з прапанаваных яму варыянтаў, будзе павялічвацца. Але часткі С, якая ёсць у Адзіным дзяржаўным экзамене ў Расіі, дзе трэба даць разгорнуты адказ, напісаць эсэ, сфармуляваць сваю думку, у нашых тэстах пакуль не будзе. Ва ўсякім разе, у 2023 годзе часткі С дакладна не будзе на цэнтралізаваным экзамене.

### Тэксты — усюды

Наколькі хутка школа рэагуе на зменлівы свет? Ці запатрабаваныя веды, што даюцца на ўроках, у рэальным жыцці? Як расстаўляць прыярытэты ў адукацыі? Адказы на гэтыя пытанні шукаюць ва ўсіх краінах свету.

Здавалася б, банальнае пытанне — чаму павінны навучаць у школе? Самы відавочны адказ — канешне, ведам. Вучань павінен засвоіць пэўны набор правілаў мовы, гістарычных фактаў, фізічных законаў, матэматычных формул і гэтак далей — нібыта ўсё лагічна. Але, насамрэч, гэта ўчарашні дзень: сёння нашмат важнейшае ўменне вырашаць рэальныя жыццёвыя задачы і самастойна працаваць з інфармацыяй, выкарыстоўваць яе, напрыклад, каб сфармуляваць свой пункт погляду ў спрэчцы, зразумець газетны артыкул, раскрыць рэкламныя маніпуляцыі і г. д.

— Мы не можам навучыць дзяцей быць творчымі, даючы ім стандартныя практыкаванні. Не можам навучыць супрацоўнічаць і працаваць у камандзе, калі на працягу ўсёй вучобы яны выступаюць як адзіночкі, якія спаборнічаюць адзін з адным, — разважае **галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук, прафесар Ганна ВАЛОЧКА.** — Мы не можам сфарміраваць у сваіх выхаванцаў здольнасць бесперапынна вучыцца, калі з першых дзён вучобы пазбаўляем іх самастойнасці ў выбары траекторыі развіцця і калі сварымся і караем іх за памылкі. Не можам навучыць суперажыванню і не сфарміруем эмацыянальны інтэлект, калі эмацыянальная сфера выключана з адукацыі...

Сёння функцыянальна пісьменны вучань з'яўляецца індыкатарам якасці адукацыі. Усе пагаджаюцца, што адных толькі акадэмічных ведаў у жыцці недастаткова, таму акцэнт ссоўваецца на ўменне выкарыстоўваць атрыманыя веды для вырашэння рознага тыпу задач у канкрэтных жыццёвых сітуацыях, на развіццё творчага пачатку, крытычнага аналізу.

Функцыянальная адукаванасць, у сваю чаргу, аб'ядноўвае чытацкую, матэматычную, прыродазнаўчанавуковую, фінансавую і інфармацыйна-камунікацыйную. Але **чытацкая адукаванасць з'яўляецца базавай для ўсіх астатніх, пад ёй маецца на ўвазе здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягаць сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці ўдзелу ў сацыяльным жыцці.**

Тэксты суправаджаюць нас усюды. Электроннае пісьмо, рэклама, інфармацыя на маркіроўцы прадукту, памятка для спажыўца, інструкцыя, схемы, графікі, дыяграмы — гэта ўсё таксама тэкст... Таму важна ўмець працаваць з любым тэкстам, адсартоўваць галоўную і другасную інфармацыю, разумець, якіх мэт спрабуе дасягнуць аўтар. Напрыклад, падчас міжнародных даследаванняў чытацкай адукаванасці могуць прапаноўвацца тэксты, якія ўтрымліваюць два розныя пункты гледжання, але аб'яднаны ў адно цэлае. Задача ўдзельнікаў — убачыць гэтыя супрацьлеглыя меркаванні.

Як заўважыла Ганна Валочка, адна з задач моўнай адукацыі — навучыць карыстацца мовай у розных сітуацыях, але камунікатыўная кампетэнцыя з'яўляецца метапрадметнай. Дарэчы, метапрадметныя вынікі былі ўключаны ў новыя Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, уведзеныя ў педагагічную практыку ў 2022/2023 навучальным годзе. Абноўленыя нормы прадугледжваюць ацэнку не толькі прадметных адукацыйных вынікаў (ведаў, уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці), але і метапрадметных (напрыклад, умення крытычна ацэньваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, узважана яе інтэрпрэтаваць і выкарыстоўваць; уменняў інтэграваць веды з розных прадметных абласцей для вырашэння практычных задач). Будзе ацэньвацца самастойнае знаходжанне вучнем інфармацыі, прад'яўленай у вывучаным матэрыяле ў няяўным выглядзе (атрыманне дадатковай інфармацыі з табліцы, схемы, малюнка...)

Ганна Валочка рэкамендавала педагогам звярнуць увагу на серыю дапаможнікаў «Кампетэнтнасны падыход», падрыхтаваную ў Нацыянальным інстытуце адукацыі. Іх змест адлюстроўвае вядучыя сусветныя тэндэнцыі ў адукацыі, улічвае патрабаванні абноўленых навучальных праграм. Заданні арыентаваны на прадукцыйную творчую работу, у ходзе якой фарміруюцца не толькі прадметныя, але таксама метапрадметныя і асобасныя кампетэнцыі.

### Эмацыянальная неінтэлектуальнасць

— Чытаць мы ўсе умеем, але ці ўсе разумеем, што чытаем? Дарэчы, а ці ведаеце вы, жыхары якіх краін выдаткоўваюць на чытанне найбольш часу? — звярнуўся да ўдзельнікаў круглага стала **начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ.** — Паводле міжнароднага даследавання, узначальвае гэты спіс Індыя: яе жыхары выдаткоўваюць на чытанне 10 гадзін 42 хвіліны ў тыдзень. Далей ідуць Тайланд (9 гадзін 24 хвіліны), Кітай (8 гадзін), Філіпіны (7 гадзін 36 хвілін), Егіпет (7 гадзін 30 хвілін), Чэхія (7 гадзін 24 хвіліны). Найбліжэйшыя нашы суседзі, якія прымалі ўдзел у даследаванні, — Расія (7 гадзін 6 хвілін) і Польшча (6 гадзін 30 хвілін). А ўнізе размясціліся такія высокаразвітыя краіны, як Тайвань (5 гадзін), Японія (4 гадзіны 6 хвілін) і Паўднёвая Карэя (3 гадзіны 6 хвілін).

Даследчыкі канстатуюць, што ў прынцыпе чытанне сёння адыходзіць на другі план і прайграе іншым спосабам баўлення часу. Увагу захапілі тэлебачанне і інтэрнэт. Ёсць і такое меркаванне, што чытанне больш актуальнае для краін з меншым развіццём эканомікай. Але ёсць і іншая думка: тыя ж японскія даследчыкі кажуць, што **чытанне кніг вядзе да развіцця галаўнога мозгу і дапамагае чалавеку адаптавацца ў свеце.**

Вячаслаў Караткевіч расказаў, што ў 2021—2022 навучальным годзе ў Беларусі праводзілася даследаванне эмацыянальных навыкаў.

— Атрыманыя вынікі асабіста мяне засмучаюць, — канстатаваў ён. — Толькі 48 працэнтаў вучняў 9 і 11 класаў добра разумеюць і кіруюць сваімі эмоцыямі і толькі 12 працэнтаў разумеюць і кіруюць эмоцыямі іншых людзей. Але мы — не ўнікальныя, аналагічныя тэндэнцыі назіраюцца і ў іншых краінах. Сур'ёзныя міжнародныя даследаванні сведчаць, што непапулярнасць чытання як баўлення часу і чытанне толькі дзеля чытання — так званае неасэнсаванае чытанне — вядуць да эмацыянальнай неінтэлектуальнасці, да таго, што чалавек збядняе свой унутраны свет. І вось мы падыходзім да такой цікавай рэчы, як асэнсаванае чытанне: гэта такі від чытання, які накіраваны на разуменне тым, хто чытае, сэнсавага зместу тэксту. На жаль, нашы даследаванні сведчаць, што часта вучні не ўмеюць вылучаць інфармацыю, якая прадстаўлена ў тэксце ў няяўным выглядзе.

А вось што паказала міжнароднае даследаванне чытацкай адукаванасці 15-гадовых беларускіх падлеткаў: са знаходжаннем інфармацыі спраўляюцца з іх амаль 65 працэнтаў, з разуменнем сэнсу — ужо толькі 62 працэнты, а ацэньваць і асэнсоўваць прачытанае могуць толькі 53 працэнты. Такім чынам, толькі палова навучэнцаў здольныя да ацэнкі і асэнсавання тэксту. Узнікае заканамернае пытанне: што з гэтым рабіць?

Вячаслаў Караткевіч звяртае ўвагу, што кнігі, якія прапануюцца школьнікам для чытання, павінны быць абсалютна розныя: у катэгорыю «сур'ёзнае чытанне» можа трапіць толькі 40 працэнтаў кніг, яшчэ 40 працэнтаў — гэта лёгкая, забаўляльная літаратура, каб дарослыя не адбілі цікавасці да чытання. І 20 працэнтаў — гэта паэтычныя творы, якія развіваюць эмацыянальныя навыкі, бо паэзія скіравана на фарміраванне эмацыянальнага інтэлекту.

Для таго каб далучыць дзяцей да чытання, вельмі важнае значэнне мае прыклад бацькоў і сумеснае чытанне. Нават проста наяўнасць у сям'і бібліятэкі ўжо ўзнімае рэйтынг вучня. У даследаванні PISA гэты фактар напрамую звязаны з паспяховасцю вучня абсалютна па ўсіх відах адукаванасці: матэматычнай, прыродазнаўчанавуковай і чытацкай.

**— Важна, каб кніга была блізкая дзіцяці, яно павінна знаходзіць у кнізе адказы, якія яму патрэбныя тут і цяпер,** — падкрэслівае Вячаслаў Караткевіч. — Напрыклад, калі ў вучня ёсць праблемы з аднагодкамі, важна прапанаваць яму кнігу, у якой падказваюцца мадэлі паводзін. Не заўсёды вучань можа напрамую параіцца з дарослымі, затое ён зможа ўбачыць адказы на свае пытанні ў мастацкім творы. Гэта будзе эфектыўны спосаб вырашэння яго ўласных унутраных праблем.

Калі мы кажам пра падлеткаў, то іх часта цікавяць прыгоды, фантастыка і жахі. Мяне часта крытыкуюць за тое, што я прапаную для чытання коміксы і жахі. Але колькі б мы ні разважалі, што гэта трэцясортная літаратура, яна не перастане іх цікавіць. Затое ў нашых сілах накіраваць гэты працэс у патрэбнае нам рэчышча. Можна практыкаваць пераказ да самага напружанага моманту. Паверце, я правяраў гэты спосаб зацікавіць у далейшым прачытанні твору на самых розных аўдыторыях — ад дашкольнікаў да дарослых людзей. Ён вельмі эфектыўны...

Не менш эфектыўны спосаб — стварэнне або прагляд буктрэйлера. У шостым класе ў праграму для дадатковага чытання ўключана кніга Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці» — гэта кніга-падарожжа, гульня, квэст. Чытачам належыць самім выбраць, адкуль пачаць падарожжа і куды перамяшчацца. На ўсім шляху неабходна збіраць артэфакты, каб атрымаць узнагароду, якая чакае ў фінале. Адметнасць кнігі-квэсту ў тым, што чытач становіцца адным з галоўных герояў і ў пошуках Вялікай Каштоўнасці праходзіць прыгодніцкім шляхам праз самыя незвычайныя і загадкавыя мясціны. На вокладцы гэтай кнігі змяшчаецца QR-код, які адсылае маленькага чытача да відэароліка, а той, у сваю чаргу, заклікае ў казку... Такое спалучэнне сучасных тэхналогій з традыцыйным чытаннем дапамагае не прайсці міма беларускамоўнай кніжкі.

Яшчэ адзін спосаб далучэння да асэнсаванага чытання — праектная дзейнасць і праекты, звязаныя з літаратурай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# КАМОДА НА ПАСАГ

## «Адмовіш — выкінем на вуліцу...»

Сям'я Дзіны Васільеўны Гарэлік, маці Галіны, пераехала ў гэты дом разам з чатырма дзецьмі і бабуляй Варварай Герасімаўнай у 1965 годзе. Дом вялікі, не ў прыклад таму, дзе жылі дагэтуль. І зямлі навокал — бяры не хачу. У 60—70-я гады мінулага стагоддзя за некалькі сантыметраў суседзі маглі і пасварыцца. Дзед, перад тым як сысці з жыцця, яшчэ паспеў сад пасадзіць, каб забяспечыць дзяцей і ўнукаў вітамінамі. Яблынькі гэтыя ўжо прыкметна пастарэлі, але дагэтуль іх галіны гнуцца пад цяжарам сакавітых пладоў.

— Маці працавала, а нашым выхаваннем займалася бабуля, — успамінае Галіна. — Яна была пісьменная, у 90 гадоў газеты чытала. Царкоўнапрыходскую школу з адзнакай закончыла, за адзін год праграму двух класаў адольвала. Біблію ведала ад пачатку да канца. І нам, унукам, расказвала, што там напісана. З лёгкасцю чытала на царкоўнаславянскай мове, ведала шмат малітваў. Нас з сястрой розным рамёствам вучыла: шыць, вышываць, вязаць. Яна ўсё сваімі рукамі рабіць умела. І працаўніца была выдатная. За поспехі ў паляводстве нават у Маскву на ВДНГ ад мясцовага калгаса пасылалі, яна і там вопытам дзялілася.

— Пакуль бацька яе быў жывы, яна ліха не ведала, — расказвае Галіна пра юнацтва бабулі. — Жылі яны на Бялыніччыне ў Старым Сяле, а ў царкоўнапрыходскую школу ў Галоўчын хадзіла. Там жа, у царкве, спявала на клірасе. Вёска па тых часах багатая была. Шмат розных крамак, майстэрань. І кавалер там да яе цікавы заляцаўся, з заможных. Яна за яго замуж збіралася.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Маці Галіны Дзіна Васільеўна Гарэлік.

Але аднойчы жыццё пайшло іншым ходам. Пасля таго як памёр бацька, яго таленавітай дачцэ на вучобе прыйшлося паставіць крыж. А там яшчэ і кавалер кудысьці з'ехаў. Дзяўчына вельмі балюча адрэагавала на гэта, усім хлопцам, якія да яе сваталіся, адмаўляла. Браты Ягор і Восіп, якія зрабілі ёй на пасаг камоду, «як у гарадской пані», сталі злавацца. І, калі яна чарговаму кавалеру адмовіла, пабяцалі: не выйдзеш за наступнага — камоду выкінем на вуліцу. Але Васіль, які не прымусіў сябе доўга чакаць, ёй сапраўды прыйшоўся даспадобы.

## Фота з гісторыяй

Галіна дастае з шафы пакет з фотаздымкамі, і падарожжа ў мінулае пачынаецца. Прыгажуня з пацеркамі на шыі, якая стаіць рукі ў бакі, і ёсць тая самая Варвара Герасімаўна. Па ўсім адчуваецца, што жанчына была — агонь.

А вось і аўтары камоды — Ягор і Восіп — прыгажуны, выглядаюць, як артысты. На жаль, жыццё Восіпа было кароткае, загінуў у баях за Адэсу ў Вялікай Айчыннай вайне.

— А вось і муж бабулі Варвары — Васіль Паўлавіч, — працягвае Галіна фота з сімпатычным мужчынам. — Шлюбам яны пабраліся ў 1923 годзе, а трох сваіх дачок назвалі імёнамі літаратурных гераінь — Дзіна, Ліда і Рая. Бабуля выбірала іх са сваіх любімых твораў. А чытала яна шмат.

На вочы трапляе радавод, дзе ў слупкі напісана шмат імён і дат. Ініцыятарам стварэння выступіла стрыечная сястра Галіны — Ірына Капыткова. Яе бацька Леанід у гады вайны быў партызанам, а ў снежні 1946-га загінуў ад рук былых паліцаяў.

— Ён працаваў старшым інспектарам аддзялення дзіцячых прыёмнікаў і ў той трагічны дзень скарачаў дарогу на работу праз возера, — расказвае падрабязнасці Галіна. — Бандыты яго падпільнавалі, забілі і кінулі ў палонку пад лёд. Пражыў усяго 23 гады.

На сайце Бялыніцкай бібліятэкі захоўваецца электронная копія дзённіка Леаніда Капыткова, які ён вёў у партызанах. Там і песні тагачасныя, і апісанне партызанскіх будняў, і лірычныя адступленні пра сям'ю. Каштоўная па сённяшніх часах рэліквія.

Вайна прынесла ў сям'ю шмат гора. Захавалася даваеннае фота бабулінай сястры, дзе яна, маці траіх дзяцей, глядзіць на свет шчаслівымі вачыма. І нічым не змераць таго гора, якім яны напоўніліся, калі немцы пры ёй расстралялі мужа. Жанчына таксама хутка памерла, сэрца не вытрымала. Дзяцей выхоўвала ўжо яе маці.

На чарговым фота — група маладых людзей. «Гэта выпускны маёй маці, — удакладняе Галіна. — Маладая жанчына пасяродку — настаўніца, яна потым і мяне вучыла».

Перабірала рукамі гэтыя сямейныя здымкі і ўвесь час круцілася ў галаве думка: шкада, што сёння людзі так мала расказваюць пра сябе і родных. І фота захоўваюць не ў альбомах, а ў мабільніках. Але гэта зусім не тое, бо 100 гадоў яны дакладна не пражывуць. І што застанецца нашчадкам?

— У гэтых фота ўсё наша жыццё, яны наша багацце, — усміхаецца Галіна. — Бывала, збяромся са старымі за сталом і слухаем іх гісторыі. Яны то пра аднаго раскажуць, то пра другога, а нам усё цікава. Адчуванне часу губляецца, ён бяжыць непрыкметна.

## Бабуліны абрусы

Услед за фота Галіна пачынае даставаць абрусы і ручнікі. Іх таксама шмат, яны такія розныя, што вочы разбягаюцца.

— Вось гэта работа яшчэ маёй прабабулі — тамбурная вышыўка, — паказвае Галіна саматкананае багацце.

Тая самая камода.

— Дарэвалюцыйная яшчэ рэч. Прабабуля лён магла выткаць як шоўк. Карункавыя падзоры для ложкаў і бабулі, і маці рабілі. Ткалі і вышывалі. І мяне гэтаму навучылі. Магу і кручком вязаць, і тамбурачкай. А на прасціне саматкананай так прыемна спаць.

— Маці шмат чаго вязала дзецям, унукам, — працягвае Галіна. — Узор убачыць і па памяці звяжа. Зараз рукі ўжо пакручаныя, баляць. Яна старэнькая, але мы рады, што яна з намі, душу грэе, як той агеньчык. Брат Васіль жыве ў Новасібірску, але таксама пры магчымасці да нас прыязджае. Тое вялікае фота на сцяне ён прыслаў. У цэнтры яго сям'я з дзецьмі і ўнукамі, а ў верхнім левым куточку — выява маці. Гэта ён спецыяльна такі калаж зрабіў, каб парадаваць нашу матулю.

## Сямейны скарб

Сёння куфары, якімі карысталіся прадзеды, не ў модзе. Але выкідаць іх рука не падымаецца. Вось і ва Уладзіміра і Галіны яны стаяць у асобным памяшканні. Камодзе болей чым сто гадоў, але і сёння як новая. Які першапачатковы быў колер, ужо ніхто і не ведае. Зараз — насычаны бардовы. Браты Галінінай бабулі былі вялікімі майстрамі, чырванадрэўшчыкамі, стваралі мэблю любой складанасці і з высакародных парод. Дэталі камоды мацуюцца паміж сабой у паз. Прычым так якасна, што здаецца: дрэва зраслося паміж сабой. Колькі ўжо гадоў прастаяла камода, а няма і намёку на спарахнеласць. Хоць увесь час падарожнічала са сваёй гаспадыняй.

— У 1936 годзе гэтая камода нават ва Украіне пабывала, — расказвае Галіна. — У тыя гады туды народ агітавалі. І бабуля з дзядулем рызыкнулі. Забралі свойскую жывёлу, тое-сёе з мэблі, у тым ліку камоду, і паехалі. Калі вярталіся, камоду назад прывезлі. Тут у яе бялізна захоўвалася, адзенне.

Побач з камодай — куфар, які ўжо рабілі бацькавы продкі. Таксама амаль стагадовага ўзросту. Ён значна прасцейшы, але ладны. У ім добра захоўваліся малако і іншыя прадукты.

Тут жа лаўкі, старадаўнія ложкі, самаробны стол. Уладзімір кажа, што ў яго на радзіме ў Чавускім раёне захаваўся стары стол з выемкамі пад цукар. Дзецям раней яго насыпалі замест цукерак.

— Гэтыя рэчы вельмі нас выручаюць і сёння, асабліва калі дзеці прыязджаюць, — усміхаюцца сужэнцы. — Ставім стол у садзе, лаўкі і пачынаем чаяваць. Адчуванні не перадаць!

Галіне з Уладзімірам падабаецца мяне здзіўляць бабулінай спадчынай. Ідзём у сад, каб паглядзець на прыстасаванне незразумелага паходжання. Гаспадар патлумачыў, што гэта сячкарня, або разніца. Быў такі інструмент у гаспадарлівых сялян. На ім можна здрабніць любую расліну для жывёлы. Датаваны ён канцом XIX стагоддзя.

У садзе, дарэчы, працяг экспазіцыі. Тыя ж лаўкі са спінкамі пад даўніну. Але гэта ўжо рабіў брат Галіны, калі прыязджаў з далёкага Новасібірска. Непрыкметна пераходзім ад разгляду мэблі да размоў пра сёлетні ўраджай. Яблыкаў было столькі, што не паспявалі прыбіраць. Гаспадарлівая Галіна ў печы насушыла аж два мяхі. «Буду частаваць тых, у каго печкі няма», — тлумачыць яна. Акрамя яблынь, у садзе хапае рознай садавіны-гародніны. Дагэтуль пладаносяць суніцы рэмантантнага паходжання, у цяпліцах было багата таматаў. Вялікая дзялянка адведзена пад бульбу. Сужэнцы смяюцца, што сёлета ўсю вёску ёй кармілі.

## Справы грамадскія

Гарод вялікі, шмат кветак паміж градкамі. За размовамі не паспяваю заўважыць, як выходзім да яшчэ адной каштоўнасці. Ужо не толькі Патарыкіных, а ўсёй вёскі Сіпайлы. Гэта крынічка, якая хаваецца ў пералеску за гародам маіх суразмоўцаў.

— Яна вельмі старая, ёй, напэўна, некалькі стагоддзяў, — каментуе Галіна. — Я помню, як сюды мясцовыя жанчыны прыходзілі па ваду. Маці расказвала, што немцы з яе таксама ваду бралі, прымушалі дзяцей наліваць у бочкі і цукеркі за работу давалі.

Аднойчы Галіна ўбачыла, як возера затапіла крыніцу, і прапанавала аднавяскоўцам яе аднавіць. Вопыт грамадскай работы, дарэчы, ужо быў. Галіна з Уладзімірам перад гэтым выступілі ініцыятарамі суботніка. І знайшлі шмат аднадумцаў, чым прыемна здзівілі і парадавалі мясцовае кіраўніцтва.

З крынічкай было складаней, прыйшлося павалтузіцца — прывезці жвіру, знайсці кольцы. Галіна кінула кліч, каб здавалі грошы, аб'яўленні размясціла ва ўсіх людных месцах: каля крамы, крыніцы. І людзі адгукнуліся, панеслі. Усё, што трэба, купілі, мужчыны некалькі дзён «лячылі» крыніцу. Яна досыць глыбокая, і вада ў ёй, нягледзячы на летнюю спёку, была ледзяная. Валанцёры па чарзе ў гумавых касцюмах у яе лазілі.

Вакол крыніцы — поўны парадак. На дрэве — ікона Бялыніцкай Божай Маці і тэкст легенды пра крыніцу. Калі работы па аднаўленні былі скончаны, запрасілі свяшчэнніка з Бялыніч, каб асвяціў месца. А з ім прыехала мясцовая ўлада і тэлебачанне. Добры рэпартаж атрымаўся.

Шэфства над крыніцай Галіна з Уладзімірам узялі на сябе: калі пачалі аднаўляць — трэба ж і даглядаць. Каб народ на машынах блізка не пад'язджаў, нацягнулі стужку. Уладзімір траву косіць, Галіна сочыць за парадкам. Каля крыніцы працякае маленькая рачулка Смалігаўка. А за пералескам — возера. Таксама, кажуць, чароўнае. Але пакінем расповед пра яго на іншы раз.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Бялыніцкі раён.*

**Фота аўтара.**

Надвор'е

# НАЧНЫЯ ЗАМАРАЗКІ, А ЎДЗЕНЬ СОНЕЧНА І АДНОСНА ЦЁПЛА

## Буракі і бульбу, нават часова, не трэба пакідаць без хованкі

**На гэтым тыдні будзе пераважаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму істотных ападкаў па краіне не чакаецца. Гэта значыць, што нас чакае цалкам камфортнае, для сярэдзіны кастрычніка, надвор'е. Толькі днём 11 і 12 кастрычніка месцамі па Беларусі будуць адзначацца невялікія кароткачасовыя дажджы, як паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Начныя замаразкі стартуюць ужо ў аўторак. У гэтыя суткі ноччу будзе пераважна без ападкаў, а раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаецца туман. Удзень паветра прагрэецца да плюс 9—14 градусаў, а па поўдні — да плюс 16 градусаў.

І ў сераду ўначы чакаецца пераважна без ападкаў. Днём месцамі па Беларусі прагназуюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 1 градуса да 7 цяпла. У асобных раёнах — замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе плюс 8—15 градусаў.

Абсалютна не будзе дажджоў і ў чацвер. У гэты дзень ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—7 градусаў. Месцамі будуць начныя замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 8—15 градусаў.

У пятніцу таксама пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 1—7 градусаў, месцамі замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Днём слупок тэрмометра дасягне адзнакі плюс 8—15 градусаў.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у ноч на суботу яшчэ захаваецца антыцыклональны характар надвор'я, а вось у ранішнія гадзіны да заходніх рэгіёнаў нашай краіны наблізіцца франтальны раздзел. У гэты час атмасферны ціск пачне падаць, павялічыцца колькасць аблокаў і пераважна па заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Таму ў суботу ўначы надвор'е будзе пераважна без ападкаў. Раніцай і днём у асноўным па заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны слабы туман. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, месцамі замаразкі — ад 0 да мінус 3 градусаў, днём тэмпература паветра падымецца да плюс 9—16 градусаў.

У Белгідрамеце папярэдзілі, што ў сувязі з начнымі замаразкамі не варта пакідаць без хованкі на палях выкапаную сельскагаспадарчую прадукцыю. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па краіне будуць згушчацца туманы, таму варта быць уважлівымі на дарогах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Агляд часопіса «Полымя»: верасень-22

# «Бог умее птушкам дараваць...»

**У вераснёўскім нумары часопіса «Полымя» сярод іншых публікацый, несумненна, вылучаецца працяг рамана Людмілы РУБЛЕЎСКАЙ «Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка Менскага». Гэта ўжо сёмы раман са знакамітага цыкла прыгодніцкіх «Авантур...» вядомай пісьменніцы і журналістк. У раздзеле «Проза і паэзія» варта параіць прачытаць апавяданні Алеся ВЕТАХА (яго падборка складаецца з чатырох твораў) і Анатоля БУТЭВІЧА — «Сівак» і «Закаханы Сарокаён, або Праўдзівае апавяданне пра птушынае каханне».**

З паэтычнымі творамі ў вераснёўскім нумары «Полымя» выступаюць Віктар ГАРДЗЕЙ (з падборкай «Бог умее птушкам дараваць...»), Уладзімір БАБКОЎ, Яўген ГУЧОК, Ірына МАКАРЧУК.

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкул Алены БОГДАН «Дыярыуш...» Афанасія Філіповіча як помнік беларускай мемуарнай прозы». 110-годдзю народнага паэта Беларусі Максіма Танка (ён доўгі час узначальваў і рэдакцыю часопіса «Полымя») прысвечаны грунтоўны артыкул знанага літаратуразнаўцы Міколы МІКУЛІЧА «Вельмі добра, што вы ёсць на свеце...». Традыцыі Максіма Танка ў беларускай паэзіі».

Цікавай падаецца вялікая падборка «Да 100-годдзя часопіса «Полымя» (нагадаем: першы нумар выйшаў у снежні 1922 года). У ёй змешчаны артыкул Сяргея ЧЫГРЫНА «Уладзіслаў Чаржынскі і часопіс «Полымя», 1920-я гады» і артыкул самога Уладзіслава ЧАРЖЫНСКАГА «Літаратурная трыбуна». Друкуецца працяг успамінаў вядомага паэта і публіцыста, «палымянца» са шматгадовым стажам, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Генадзя ПАШКОВА «Круціла жорны завіруха, або Ля цяпельца «Полымя». Праўдзівыя гісторыі ад іх удзельніка і сведкі». З мемуарнай нататкай «Далёкае і блізкае» выступае лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Георгій МАРЧУК.

У «Кнігарні» — рэцэнзіі на кнігі Вячаслава Чамярыцкага «Жыватворная спадчына» і лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхася Башлакова «На зветраных шляхах».

Дарэчы, на другой вокладцы вераснёўскага нумара «Полымя» — верш Максіма Танка: *«*** Прыпісалі: спакой / І нейкія кроплі. / Забаранілі хадзіць, / І раптам бачу: / Сарваўся з вешалкі / Мой капялюш, / А за ім — плашч, / А за плашчом / Ціха падаліся за дзверы / Мае старыя сябры — / Дарожны кій / І боты... / Куды гэта яны?.. / Ледзь дагнаў іх / На нарачанскай / Дарозе».*

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Аналітыкі адзначылі сыход маладых спецыялістаў з Нью-Ёрка і Каліфорніі

Маладыя людзі з высокімі даходамі актыўна перасяляюцца з самых дарагіх амерыканскіх штатаў у рэгіёны з больш умеранымі цэнамі, паказала даследаванне SmartAsset. Пра гэта паведаміла CNBC. Аналітыкі вывучалі групу, якую яны назвалі «багатыя маладыя прафесіяналы» — грамадзяне маладзейшыя за 35 гадоў з гадавым даходам звыш $100 тысяч да выліку падаткаў. Штат Нью-Ёрк зафіксаваў чысты адток ва ўказанай катэгорыі ў колькасці звыш 15,7 тысячы чалавек. На другім месцы размясцілася Каліфорнія з паказчыкам амаль у восем тысяч. У тройцы самых папулярных напрамкаў апынуліся Тэхас (чысты прыток звыш 3,8 тысячы чалавек) і Фларыда (звыш 3,4 тысячы чалавек), дзе няма падаходнага падатку, а таксама Вашынгтон (звыш 2,7 тысячы чалавек). Таксама істотны прыток багатых прафесіяналаў зафіксаваны ў Каларада, Нью-Джэрсі і Паўночнай Караліне.

### Брытанцаў папярэдзілі аб адключэнні электрычнасці на тры гадзіны штодня

Аб такой магчымасці папярэдзіў аператар газавых і электрасетак National Grid Plc. Кампанія, якая забяспечвае энергіяй дамы і бізнес у Англіі, Шатландыі і Уэльсе, паведаміла, што ў адпаведнасці з яе «базавым сцэнарыем» у спажыўцоў не ўзнікне праблем, і адключэнні электраэнергіі ўяўляюцца «малаверагоднымі». Аднак яны магчымыя ў «найгоршым сцэнары», у адпаведнасці з якім пастаўкі газу будуць надзвычай невялікімі. Аператар паабяцаў, што спажыўцоў папярэдзяць аб адключэнні электраэнергіі загадзя. Верагодней за ўсё, адключэнне будзе адбывацца ў пікавыя гадзіны — раніцай ці паміж 16 і 19 гадзінамі па мясцовым часе.

### У Кішынёве на мітынг апазіцыі сабралася каля 60 тысяч чалавек

Пратэстоўцы незадаволены ростам цэн і вынікамі дзейнасці праеўрапейскага ўрада Малдавіі. Аб гэтым заявіў адзін з лідараў пратэсту, старшыня Аргееўскага раёна Малдавіі Дзіну Цуркану, паведаміла ТАСС. «На мітынг у Кішынёве сабраліся каля 60 тысяч чалавек. Яшчэ шэсць-дзевяць тысяч чалавек не патрапілі на пратэст, бо сутыкнуліся з паліцыяй, якая перашкаджала праезду ў Кішынёў на аўтобусах», — сказаў ён. Акцыя праходзіла перад будынкамі адміністрацыі прэзідэнта і парламента. Як паведаміла ТАСС з месца падзеі, дэманстранты скандуюць «Далоў [прэзідэнта Малдавіі] Маю Санду!», «Урад у адстаўку!», «Датэрміновыя выбары!». Акрамя таго, апазіцыя выставіла новыя патрабаванні ўладам. Яны датычацца выплат кампенсацый грамадзянам з прычыны падарожання электраэнергіі і газу, кошты на якія ўзраслі з мінулага года амаль у сем разоў. Акцыі пратэсту пачаліся ў Малдавіі летам, яны праходзілі ў Кішынёве і Гагаўскай аўтаноміі. Іх удзельнікі абвінавачваюць праеўрапейскія ўлады ў няздольнасці справіцца з эканамічным крызісам, указваюць на рост цэн, а таксама рэзкае падзенне ўзроўню жыцця.


БАНК РЕШЕНИЕ

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 1 октября 2022 г.**

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2022 | 01.01.2022 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 12 070 | 10 938 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 775 | 11 291 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 56 297 | 34 714 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 18 225 | 31 662 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 99 067 | 126 367 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 74 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 460 | 460 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 21 025 | 21 287 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 331 | 379 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 267 | 1 284 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 213 | 218 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 2 754 | 5 746 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 218 484 | 244 420 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | 7 072 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 13 817 | 7 608 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 134 854 | 160 221 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 11 291 | 12 541 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 69 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 905 | 3 859 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 161 867 | 191 370 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 35 988 | 35 988 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 2 613 | 2 469 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 554 | 12 813 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5 462 | 1 780 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 56 617 | 53 050 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 218 484 | 244 420 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**на 1 октября 2022 г.**

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2022 | 01.10.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 14 537 | 14 530 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 143 | 9 329 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 394 | 5 201 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 13 034 | 9 333 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 8 207 | 3 298 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 827 | 6 035 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (270) | (389) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 12 818 | 1 408 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (797) | 412 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 8 462 | 1 202 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 374 | 1 717 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 11 439 | 11 040 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 229 | 397 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 4 216 | 1 745 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 615 | 155 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 601 | 1 590 |

Председатель Правления С.Д. Будников

Главный бухгалтер В.С. Боричевская

Дата подписания: 05 октября 2022 г.

ЗАО «Банк «Решение», УНП 100789114. Лиц. № 14 от 08.06.2016 НБ РБ

Ёсць пытанне

# АЎТАКРАМА ЗАМЕСТ ГАСТРАНОМА?

## Чаму закрыццё магазіна стала выпрабаваннем для жыхароў Заводскага раёна сталіцы

**Жыхары пасёлка Сосны і ваеннага гарадка з гэткай жа назвай (так па-ранейшаму называюць сваё месца жыхарства многія тутэйшыя, хоць вуліцы Красіна і Паўлоўскага ўжо каторы год належаць Заводскаму раёну Мінска) сцвярджаюць, што на іх тэрыторыі з вясны «ставяць эксперымент». Ім даводзіцца дабірацца дадому вакольным шляхам, які дадае да дарогі сем кіламетраў і каля 20 хвілін часу. Прычына — разабраны пуцепровад. З верасня, праўда, ужо можна трапіць дадому напрасткі, перайшоўшы цераз мост (які будуецца нанава) пешшу. А ў маі ў Соснах зачынілі самы буйны і пры гэтым адзіны гастраном па вуліцы Красіна. Цяпер тут працуюць толькі невялікая крама і магазін буйнога сеткавага рытэйлу па вуліцы Паўлоўскага — паміж двума магазінамі паўтара кіламетра праз лес або два прыпынкі на аўтобусе. Замест гастранома — да пакупнікоў два разы на тыдзень прыязджае аўтакрама той жа сеткі, але, здараецца, не бывае і яе. Чаго чакаць жыхарам, якія звярнуліся ў рэдакцыю з калектыўным пытаннем, высвятляла карэспандэнт «Звязды».**

### ВЫБАР — МЕНШЫ, КОШТ — БОЛЬШЫ

Гастраном у Соснах належаў Мінскаму холадакамбінату № 2 і працаваў спраўна, адзначаюць месцічы. Тут быў досыць шыроки малочна-мясны асартымент, існаваў добры выбар іншых прадуктаў. Аднак у 2021-м да холадакамбіната далучылі вядомую сетку крам (разам з яе даўгамі). Нейкі час гастраном яшчэ заставаўся на плаву, хоць грошай на набыццё новай прадукцыі ўжо не было (абнаўляліся хіба што хлебмалако). Аддзелы адзін за адным закрываліся, пакуль у маі цалкам не перастала існаваць і ўся крама, якую холадакамбінат закрыў праз нерэнтабельнасць і выставіў на аўкцыён.

Людзі скардзяцца, што закрыццё магазіна стала для іх другой пасля моста катастрофай, бо цяпер набыць прадукты — цэлы квэст. Аўтакрама не надта дапамагае — выбар малы, і трэба яшчэ заспець яе прыезд, сцвярджаюць мясцовыя жыхары, з якімі я пагутарыла акурат падчас наведвання імі аўтакрамы.

— Магазін нам вельмі патрэбны. У аўтакраме я купляю дробязь. А пасля еду ў Мінск, стаю ў чэргах у адной краме, у другой, трэцяй. Збіраю клункі і вязу ўсё гэта дадому па доўгай дарозе з-за адсутнасці моста, — кажа **Мікалай Васілевіч**.

— Я купіла тут толькі кефір, — далучаецца да размовы **Наталля Манжос**. — А мне патрэбны зусім іншыя прадукты. Свежае мяса, каўбасы. Я павінна паглядзець, памацаць, прыцаніцца. А тут ты павінен хуценька нешта ўзяць, каб не замінаць наступным пакупнікам. Кошт у аўтакраме, дарэчы, зусім не бюджэтны. Нават смятана даражэйшая, чым проста ў краме, што на Паўлоўскага.

Наракаюць мясцовыя жыхары і на асартыментны пералік і кажуць, што ім неабходная разнастайнасць. Сметанковае масла тут — нізкай тлустасці, а з вялікай — няма. Бутэлькі з вадой вялікія, а маленькіх, каб узяць з сабою, — няма.

— Чалавек прыйшоў сюды не дакупіць нешта, а набыць прадукты. Вось у мяне пусты халадзільнік. А што я тут вазьму? — дадае **Надзея Жукоўская**.

Абедзве жанчыны трапілі сюды на работу ў Інстытут ядзернай энергетыкі па размеркаванні ў

1974-м. Тут выраслі іх дзеці і ўнукі. Яны ўспамінаюць, што калісьці былі ў Соснах і паліклініка, і стаматалогія, і пральня, і бары. А цяпер уся інфраструктура паступова знікае.

Таццяна, прадавец з аўтакрамы, якая за час нашай размовы з жыхарамі ўжо адпрацавала сваю гадзіну, кажа, што выручка ў Соснах — 100, 150 рублёў, а самая вялікая пакупка сёння — на 10 рублёў.

— Я ў Соснах першы раз. Бралі малако, батон, гародніну, садавіну, але ж спадзяёмся, што пачнуць і мяса купляць, і каўбасу.

### ДАЛЁКА, ЦЯЖКА, НЯЗРУЧНА...

Аўтакрама ніколі не перакрые асартымент, які прапануецца ў вялікіх крамах, таму аўтаўладальнікі з Соснаў будуць працягваць вазіць прадукты «з горада», як тут кажуць пра сталічныя крамы. У асноўным гэта моладзь, якая, дарэчы, не так мае патрэбу ў гастраноме, аднак яны непакояцца за тых, каму цяжка і далёка ездзіць у Мінск. «У Соснах жыве шмат пенсіянераў, маці з малымі дзецьмі і іншых людзей, якія маюць патрэбу. І ў іх няма магчымасці выехаць па прадукты далёка ад дому. Цяпер у іх выбар — або асартымент аўтакрамы, які ніяк не заменіць выбар у вялікім гастраноме, або ехаць у сеткавы магазін, што ў ваенным гарадку Сосны. А ён і невялікі, і дабірацца нават да яго трэба або на аўтобусе два прыпынкі, або праз лес пешшу больш за кіламетр. А як гэта здолець старым ці мамам з каляскамі?». Такія пытанні і праблемы ўзнімаюць у калектыўным лісце жыхары.

Іншым падабаўся мясны выбар у гастраноме ад холадакамбіната, дзе можна было і сабе мяса ды каўбас набыць, і хатнім гадаванцам замарожаных шый ці костак узяць. У дзень прывозу, кажуць, з раніцы збіраліся гаспадары жывёлін, каб набыць пачастунак сваім чатырохлапым.

— Шматдзетныя не могуць ездзіць далёка і валачы на сабе клункі з ежай з горада. А хадзіць у гіпермаркеты з маленькімі дзеткамі таксама цяжка. Таму гастраном ратаваў. Пакуль малыя днём спяць, мамам было зручна збегаць сюды, і ён карыстаўся попытам у пакупнікоў. Бралі тут і каўбасы, і мяса. І нават некаторыя цэны былі меншымі, чым у крамах у Мінску, — перакананая маладая мама **Іна Ганчарык**.

Крама ў ваенным гарадку Сосны зусім не ў крокавай даступнасці для жыхароў пасёлка Сосны. Цяпер і цямнець пачало раней, і калі праз лес ісці, то на гару па дарозе падымацца. Нязручна, адным словам, лічыць мясцовая актывістка **Алена**, якая хоць і жыве тут некалькі гадоў, аднак за месяцы перажывае і ініцыіравала калектыўны збор подпісаў:

— А яшчэ ў нас расклад руху транспарту разлічаны пад рэжым работы школы, таму ўвечары, нават набыўшы прадукты ў гарадку, прыйдзецца прайсціся да дому па пасёлку пешшу.

У пацвярджэнне яе слоў міма з двума пакетамі пакупак праходзіць яшчэ адна жыхарка, **Таццяна Вінакурава**, якая вяртаецца з крамы ў ваенным гарадку:

— Я пасля другой змены збегала ў краму ў гарадку, а цяпер, хай і пешшу, але нясу прадукты дадому. Праўда, пад'ехала адзін прыпынак на аўтобусе. Тут і цукар, і алей, якія з Мінска везці далёка і цяжка. А ў маленькай краме, што на Красіна, і цэны завышаныя, і выбару амаль няма. Ды і праз лес я хадзіць адна баюся, бо ў нас сабак бадзяжных шмат.

### ДА НОВАГА ГОДА БУДЗЕ НОВЫ МАГАЗІН

Першы аўкцыён па продажы права арэнды гастранома адбыўся яшчэ ў маі з каэфіцыентам 3 — тады нерухомасць не карысталася попытам. Другі прайшоў у канцы жніўня і меў ужо каэфіцыент 1. І гэтым разам яго арандавала вядомая гандлёвая кампанія, якая плануе да канца года арганізаваць на месцы былога гастранома сваю краму, паведамілі ў прэс-службе кампаніі:

— Цяпер спецыялістамі распрацоўваецца тэхналогія гандлёвай залы і падсобных памяшканняў з улікам тэхнічных магчымасцяў і патрабаванняў з боку дзяржаўных службаў: Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і іншых. Памеры гандлёвай плошчы не зменяцца. А асартымент тавараў у межах гандлёвай пляцоўкі будзе прадстаўлены аналагічна фармату іншых нашых крам з вялікім выбарам прадукцыі беларускіх вытворцаў і сацыяльна значных тавараў, а таксама якаснай садавіной і гароднінай.

Абяцаюць, што ў новай краме будуць і цэхі з уласнай вытворчасцю, участак грыля і аддзел са свежай выпечкай, а таксама вітрына з вагавой мясной прадукцыяй.

Работы па рэканструкцыі другога паверха будынка ўжо пакрысе распачынаюцца. Сфарміравана будаўнічая брыгада і план-схема, расказалі ў адміністрацыі Заводскага раёна і запэўнілі, што за пытаннем аднаўлення крамы ў Соснах сочаць:

— Мы яшчэ да першага аўкцыёну прапаноўвалі будынак усім магчымым гандлёвым сеткам. Аднак ён мае складаную лагістыку па аддаленасці ад Мінска, і многія адмаўляліся менавіта з гэтага пункту гледжання. Аднак у жніўні ўсё склалася на карысць крамы буйнога сеткавага рытэйлу, — падзялілася **Вольга ПРАКАЦЕНЬ, начальнік аддзела гандлю адміністрацыі Заводскага раёна Мінска**.

### МАДЭРНІЗАЦЫЯ, АПТЭКА, ЗРЫЎ ГРАФІКА

Абавязковы рамонт будынка перад пачаткам работы быў яшчэ адным момантам, які палохаў патэнцыяльных удзельнікаў аўкцыёну, аднак рэканструкцыя тут была проста неабходная, настойваюць у адміністрацыі:

— Мадэрнізацыя гастранома патрабавалася даўно. Сцены, столь і падлога былі ў вельмі недагледжаным стане. А дыхтоўны рамонт не праводзіўся з часоў хіба ці не ўзвядзення будынка ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Выкарыстоўваць памяшканне ў такім стане, як цяпер, проста немагчыма. Спачатку трэба прывесці яго ў належны стан адпаведна з усімі стандартамі.

Харчовы магазін займаў другі паверх гастранома, а на першым былі арэндныя памяшканні, з якіх апошнім часам працавалі невялікая непрадуктовая крама і аптэка. Апошняя працуе і сёння, аднак чуткі пра магчымае яе закрыццё узрушваюць людзей ці не больш, чым адсутнасць гастранома.

— Аптэка, як і ўсе астатнія памяшканні на першым паверсе, — гэта зона адказнасці ЖРЭА Заводскага раёна (холадакамбінату належаў толькі другі паверх будынка). І яна будзе працаваць і далей, а дагавор на арэнду ў яе дзейнічае яшчэ два-тры гады, — супакойвае Вольга Пракацень.

Жыхары Соснаў, дарэчы, скардзяцца і на тое, што аўтакрама са сваім не надта шырокім асартыментам некалькі разоў проста не прыйшла ў абазначаны дзень.

— Адзін раз аўтакрама не прыйшла, бо быў вялізны збой у сістэме гандлёвай сеткі — тады ніводная аўтакрама не выйшла на маршрут. Такі ж форс-мажор адбыўся і ў другі раз, — запэўніла прадстаўніца адміністрацыі. — А прадстаўнікі сеткі нават ездзілі па пунктах шляху аўтакрамы і прасілі прабачэння, што машына не выйдзе на маршрут, бо тэхнікі выпраўляюць збой.

Сосенцам раяць крыху пачакаць, бо набываць прадукты да навагодняга стала яны ўжо амаль дакладна змогуць у новай краме.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

# «УСТАВАЙЦЕ, ДЗЕТКІ,

## У Маларыцкім раёне ў 1942—1944 гадах

**Няпроста слухаць сведчанні апошніх жыхароў невялічкай вёскі на самай граніцы з Украінай, нават у дыктафонным запісе. Здавалася б, людзі гавораць без асаблівых эмоцый, амаль будзённа, пра даўно перажытае, пра расстрэлы, слёзы, гора. Але будзённасць гэтая нацягнутая, як пранізваюць адгалоскі жахлівага мінулага. Бабуля Настасся Хведчык увесь час цяжка ўздыхае, згадваючы той страшны дзень расстрэлу, крыху дрыжыць яе голас. Столькі гадоў прайшло, але ж такое не можа забыцца. Шмат гора пабачылі тутэйшыя людзі.**

### АСАБЛІВЫ ЛЁС ХМЕЛІШЧА

Ёсць вёскі, якія вайна амаль што абышла бокам, якія і пасля яе жылі звычайным калгасным жыццём, гадавалі дзяцей, выпраўлялі іх у вялікі свет. А па іншых зусім бязлітасна прайшоўся лёс, яны ўвасобілі ўвесь трагічны пласт гісторыі краю. Да апошніх і адносіцца Хмелішча.

Яно згубілася далёка ў лясах. Нават указальнік, які стаіць каля Навалесся на трасе з адзнакай «3», у сэнсе тры кіламетры, падманвае выпадковага падарожніка. Аказалася, тут не тры, а нават крышачку больш за пяць кіламетраў па лесе, засякалі па спідометры. «І дарога асаблівая, — расказвае **старшыня Олтушскага сельскага Савета Вітольд ПЯТКЕВІЧ**, — гэта па-

Старшыня сельскага Савета Вітольд ПЯТКЕВІЧ каля помніка загінулым жыхарам Хмелішча.

адрасуючы праклёны і новай уладзе, і ўсім яе ўпаўнаважным. Каб хто тады сказаў ім, што ад'езд стане паратункам ад смерці, не паверылі б. Але пасля вайны, у 1947-м, яны вернуцца, а вось сваякоў і суседзяў не застануць, бо тых расстраляюць.

### «КАМПАНІЯ БЕЗ ІНЦЫДЭНТАЎ»

23 кастрычніка споўніцца 80 гадоў з таго страшнага дня, калі расстралялі 128 жыхароў вёскі. Потым камандзір паліцэйскага палка капітан Пельс напіша справаздачу, яна ёсць у кнізе «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі». У дакументе значыцца: «Расстраляна 28 мужчын, 40 жанчын, 60 дзяцей. Спалены 21 сялянскі двор. Кампанія была скончана без інцыдэнтаў у 23.00».

гранічная зона, ехаць можна, спыняцца машынай на гэтай дарозе нельга. На правую ўзбочыну можна ступіць нагой, на левую — нельга».

...Першае выпрабаванне перажыло Хмелішча, калі перад самай вайной, у 1940-м, вывезлі ў Сібір самых заможных гаспадароў. Жыхар Хмелішча Сцяпан Чуль кажа, што не памешчыкаў, а працавітых яскоўцаў, якія на зямлі здолелі здабыць крыху большы за астатніх дабрабыт для сваёй сям'і. Аж у Іркуцкай вобласці апынуўся малы Іван Сымонік. Яго бацьку з жонкай і пяццю дзецьмі вывезлі як «кулацкі элемент» разам з іншымі гаспадарамі. Яны, вядома, з'язджалі са сваіх дамоў, жылі ў цяжкіх умовах, але выжылі. Вясной на папялішчы сваёй хаты каля ацалелай грушы бацька збіў будан, там пражылі лета. Другую зіму кватаравалі ў іншых сваякоў. А ў 1944-м бацьку забралі на фронт, нас, як сям'ю франтавіка, часова засялілі ў апусцелы дом яўрэяў, іх таксам расстралялі. Так і пражылі.

Сцяпан Чуль ведае гэтую трагічную гісторыю з аповедаў бацькоў, бабуль-дзядуль. Гаварылі, што фармальнай падставай для экзекуцыі паслужыў нейкі дзівак у зямлянцы, які жыў там даўно. «Ніякі ён не партызан, так, дробны злодзюжка, сядзеў сабе ў лесе». А немцы яго знайшлі і паставілі ў віну насельніцтву вёскі, што не данеслі пра нелегала акупацыйным уладам. За гэтым ішло пакаранне: усе — старыя і малыя — падлягалі знішчэнню за выключэннем тых, чые дзеці былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію. А калі гналі моладзь, як не хацелі юнакі і дзяўчаты пакідаць дамы і бацькоў, плакалі. Каб ведалі, што гэтым ратуюць свае сем'і...

Так і сям'я Анастасіі Архіпаўны Хведчык ацалела, бо ў далёкую чужую Германію вывезлі брата. 92-гадовая жанчына гаварыла, што той дзень памятае як сёння.

Настасся ХВЕДЧЫК.

— У нас солтыс быў дрэнны, жорсткі, яго заўсёды пераследавалі партызаны, ён нават у хаце сваёй начаваць баяўся. Можа, таму і спалілі нашу вёску, можа, сам ён і навёў немцаў на тую зямлянку нібыта партызана. Потым яго забралі, пасля вайны ўжо, і больш ніхто не бачыў яго... А тады прыехалі да нас, заходзілі ў кожны дом, выводзілі ўсіх і строілі ў адну шарэнгу, нават малога браціка, які спаў у калысцы, загадалі браць з сабой. Галаве сям'і задавалі пытанне: «Уся сям'я тут?» Калі адказвалі, што ўся, іх пакідалі на вуліцы. Таму, хто гаварыў, што сын альбо дачка ў Германіі, загадвалі вярнуцца ў хату, такіх набралася дзевяць сем'яў. Астатніх пагналі за вёску, мужчынам далі ў рукі рыдлёўкі, загадалі капаць яму. Людзі здагадаліся, для чаго яма. Стаяў страшэнны гул, жанчыны галасілі, дзеці плакалі, старэйшыя чыталі малітвы. У нас, хто застаўся ў хатах, таксама пачынала паніка. Мы маглі хадзіць адно да аднаго, некаторыя казалі, што нас, можа, падпаляць разам з хатамі, іншыя выказвалі спадзяванне на паратунак, словам, ніхто нічога не ведаў дакладна.

Сцяпан ЧУЛЬ.

Помнік ахвярам вёскі Субаты.

— У гэтым жаху мы правялі даволі доўга, яны наляцелі на вёску недзе на світанні, і працягвалася ўсё да позняга вечара, — расказвае сведка страшных падзей. — Першую партыю людзей падвялі да ямы, мы з хаты пачулі крык, енк, потым першыя стрэлы куляметаў. Мой бацька ўпаў без памяці, вытрымаць такое было, здаецца, немагчыма. І не слабак жа быў, потым ён вернецца з вайны з медалём «За адвагу»... Другі раз, калі павялі людзей, галасоў было менш, а пасля трэцяга расстрэлу галасы сціхлі зусім. Тут ужо і мы чакалі сваёй смерці. Адчынілася дзверы, зайшоў ці то фашыст, ці іх прыслужнік і па-польску сказаў нам, што можам узяць падводу, асабістыя рэчы і праз пару-гадзіны нас тут не павінна быць. Так і паехалі ў белы свет. У бацькі ў Олтушы быў стрыечны брат. Да яго напрасіліся на зіму: нас шэсць чалавек, іх пяць, а хата маленькая. Цяпер нават уявіць цяжка, як можна было жыць у такіх умовах, але жылі. Вясной на папялішчы сваёй хаты каля ацалелай грушы бацька збіў будан, там пражылі лета. Другую зіму кватаравалі ў іншых сваякоў. А ў 1944-м бацьку забралі на фронт, нас, як сям'ю франтавіка, часова засялілі ў апусцелы дом яўрэяў, іх таксам расстралялі. Так і пражылі.

— Колькі гора, бяды нацярпеліся, дзеткі мае, — кажа бабуля Настасся. — Але жывыя засталіся. Бацька вярнуўся з вайны, радасць была, хату для сям'і пабудаваў.

Цяпер вядзецца рамонт помніка, устаноўленага ў пачатку вёскі. 23 кастрычніка тут адбудзецца жалобны мітынг. Настасся Хведчык абяцала прыйсці: яна лічыць сваім абавязкам гаварыць, каб маладыя ведалі пра жахі вайны.

### ГАРОТНЫЯ СУБАТЫ

Маларыцкі раён быў акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі на чацвёрты дзень вайны. І ўжо з першых дзён акупанты адчулі супраціўленне. Па-першае, арганізоўваліся ў атрады адсталыя ад часцей чырвонаармейцы, да іх далучаліся мясцовыя жыхары. Даволі хутка з'явіліся партызанскія атрады. У барацьбе з партызанамі захопнікі далёка не заўсёды мелі поспех, таму злосць спаганялі на мірным насельніцтве. Запаланелі ў акрузе вёскі. Каля паўсотні населеных пунктаў было спалена ў 1942–1944 гадах: Боркі, Брадзяцін, Забалацце, Масявічы, Радзеж, Субаты, Хмелішча, Хаціслаў... У рэспубліканскай электроннай базе даных «Беларускія вёскі, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны» ёсць і Субаты, дзе засталася адна жыхарка.

Амаль у кожнай спаленай вёсцы ёсць помнік трагічным падзеям. Ёсць помнікі дыхтоўныя, пастаўленыя ў 1970-1980 гады альбо блізкай да нашага часу, а ёсць сціплыя, непрыкметныя, але не менш важныя. Як гэты, у Субатах. Са старшынёй раённага Савета Алегам Якубчыкам у лесе той помнік знаходзім хутка. Відаць, што гэты прымітыўны абеліск быў пастаўлены вельмі даўно. Пазней зрабілі мемарыяльную дошку, на якой увекавечылі прозвішчы людзей, што ўдалося ўстанавіць. Агароджа бліжэйшых свежай фарбай, на вялікай брацкай магіле растуць шматгадовыя кветкі. Іх некалі пасадзіла Надзея Вакульская. Пакуль жыла, сюды заўсёды прыходзіла, тут ляжаць яе сваякі. Каб не той зверскі расстрэл, можа, сёння Субаты не аказаліся б у спісе вёсак, якія дажылі свой век.

У маім архіве захоўваюцца ўспаміны апошняй жыхаркі вёскі Субаты Вольгі Канстанцінаўны Букач.

Варта сказаць, што ніколі да гэтага я не чула пра такую форму расправы над жыхарамі акупаванай тэрыторыі, пра якую расказалі тут. Раней мае героі распавядалі, як знішчалі людзей цэлымі вёскамі, альбо расстрэльвалі асобных за сувязі з партызанамі... У Субаты прыехаў карны атрад і правёў фашысцкую «прафілактыку» асаблівым чынам.

Выводзілі з кожнай хаты сям'ю і звяралі наяўных яе членаў са спісам. Калі дома не было кагосьці з мужчын, аўтаматычна залічвалася, што ён вае ў рэгулярнай арміі альбо ў партызанскім атрадзе. Такую сям'ю каралі: выводзілі ў лес амаль за кіламетр ад вёскі і забівалі, уключаючы старых і малых. У самы разгар гэтай аперацыі пастуліла нейкая іншая каманда з пасыльным, немцы паспешна сабраліся і з'ехалі. Такім чынам, каго паспелі — расстралялі, некаторым пашанцавала. Гэтую трагічную гісторыю і апошняя жыхарка вёскі Вольга Букач, і старшыня Чарнянскага сельскага Савета Аляксандр Пятручык

Вольга БУКАЧ.

чулі ад мясцовай старажылкі Надзеі Вакульскай. Ужо пяць гадоў як няма Надзеі Іосіфаўны. Яна расказвала, што да вайны Субаты лічыліся вялікай вёскай — і школа была тут, і магазін.

А калі Вольга Канстанцінаўна Букач прыйшла ў 1958-м з Жабінкаўскага раёна ў дом да маладога мужа, у Субатах налічвалася ўсяго 12 хат. Цяпер засталося тры сядзібы і толькі адна жылая.

### КАНВЕЕР СМЕРЦІ ПРАЦАВАЎ БЕЗ ЗБОЯЎ

23 верасня споўнілася 80 гадоў з дня трагедыі вёскі Боркі. Сведчанні відавочцаў гэтага жорсткага злачынства ў свой час запісалі пісьменнікі Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік у кнізе «Я з вогненнай вёскі». «Канвеер смерці працаваў без збояў, дакладна і зладжана. На месца толькі што расстраляных сялян заступала новая партыя. Перад забойствам людзей, нягледзячы на пол і ўзрост, фашысты распраналі дагала...»

У той дзень у 1942 годзе ў вёсцы забілі больш за 700 чалавек. А днём раней трэці батальён 15-га паліцэйскага палка нямецкай арміі, а дакладней, 10-я рота, адзін унтэр-афіцэр, 7 салдат штабнога канвою і тры кіроўцы атрымалі заданне знішчыць размешчаную на паўночны ўсход ад Макран вёску Боркі. Яшчэ за тры дні да гэтага стараста і дзясятнік хадзілі па вёсцы і запісвалі, колькі чалавек пражывае ў кожным доме нібыта для статыстыкі.

Падрыхтоўка да карнай аперацыі пачалася ў ноч на 23 верасня. Яшчэ напярэдадні вечарам вяскоўцы чулі нямецкую гаворку ў акрузе, але не асабліва звярталі ўвагу: ішла вайна, кругом стаялі немцы. А ўжо а палове пятай раніцы акупанты акружылі вёску разам з хутарамі. Па чарзе заходзілі ў кожны дом і загадвалі ўсім ісці на сход у цэнтр вёскі. Мужчынам загадалі ўзяць рыдлёўкі.

Паступова ўсіх жыхароў вёскі сабралі ў агародзе старасты. Найбольш дужых мужчын паставілі ў шарэнгу на могілках капаць дзве ямы, па суткасці ж траншэю, якая потым стане іх магілай. Людзі да апошняга не верылі, што іх пахаваюць тут жа. Тых, хто капаў, расстралялі першымі.

Мужчыны ўсё ж здагадаліся аб прызначэнні траншэі. Сцяпан Мішчук, што капаў, прапанаваў таварышам кінуцца на канвеір з рыдлёўкамі, але нехта з іх разумеў намер і расстраляў адважнага вяскоўца. Тых, хто распрабаваў уцячы, даганялі кулямётным агнём.

### УСПАМІНЫ З АРХІВА БІБЛІЯТЭКІ

У цэнтральнай раённай бібліятэцы захоўваецца багаты матэрыял па гісторыі Борак. Запісаныя ўспаміны многіх відавочцаў расстрэлу. У іх ліку — сведчанні Міхаіла Ярмалюка. Мішу тады было 11 гадоў:

«Наша сям'я жыла на хутары, — згадваў Міхаіл Захаравіч. — Зранку бацька пайшоў шукаць авечак, якія з вечара разбегліся па лесе. Раптам на парозе з'явіліся немцы і сталі абшукваць дом. Пачалі выстраль, і мама падумала, што забілі бацьку...

Сабралі людзей у адным месцы, спачатку казалі, што на сход, але людзі разумелі, што ніякага сходу не будзе. А калі павялі першую партыю людзей на могілкі, жанчыны сталі галасіць. Я не бачыў расстрэлу, але ўсё чуў. Раптам убачыў свайго дзядзьку, які капаў магілу, а потым вярнуўся, каб забрацца сваю сям'ю на расстрэл. Мама плакала і абдымала малодшых братоў. А дзядзька сказаў ёй: «Даруй, сястра, не магу цябе выратаць».

Мы з малымі сядзелі ў сваім агародзе ў высокай траве і баяліся, каб хто не ўбачыў нас. А потым не маглі прыйсці ў сябе і ўсвядоміць, што цудам выратаваліся».

Але іх сям'і пашанцавала. І сярод немцаў былі ўсялякія людзі. Вось і вартавы, што стаяў каля іх дома, дапамог сям'і выбрацца за ачапленне. Засталіся ўсе: бацькі і пяцёра дзяцей.

Паводле ўспамінаў Палiны Курапатчык, якой на той час было дзевяць гадоў, калі сталі ўсіх згоняць, яе маці хацела ўзяць з сабой хлеб. Але нямецкі салдат забараніў. Сказаў, што будзе перапіс, потым усе вернуцца дадому.

«Жыхароў вёскі сагналі і пасадзілі ў агародзе. Кругом абвыавалася невыносная. Дзеці енчылі, жанчыны галасілі. Я таксама крычала і плакала, — сведчыла жанчына. — Але мама супакойвала, гаварыла, што ўсе будзем разам. А ў гэты час ужо трэцюю групу на смерць паслалі. І тут стараста паклікаў нашу сям'ю і нешта сказаў да старшага ра-нямецку. Мы нічога не зразумелі. А я як абцугамі ўчапілася ў руку бацькі. І цяпер памятаю, як ногі халадзелі і рабілася нібы ватныя. Як высвятлілася потым, стараста сказаў, што мы не з Борак, а з суседняй вёскі Макраны. І тым самым падарыў нам жыццё».

### ВЫРАТАВАЛІСЯ АДЗІНКІ

Выжыла і Марыя Лiхван. Потым яна ўспамінала, што ўстала рана, каб распаліць печ і прыгатаваць ежу. Глянула ў акно — адусюль наступаюць немцы. Двое хутка зайшлі ў хату, загадалі збірацца, ісці на сход. Яны сабраліся, узялі з сабой хлеба, як выходзілі з дому, пачало віднець. Самаму маленькаму дзіцяці было ўсяго шэсць тыдняў. Зайшлі на агарод, немец загадаў выйсці ўсім мужчынам ад 18 да 40 гадоў. Муж пацалаваў дзяцей, развітаўся і сышоў. Іх пагналі на дарогу. А тыя немцы, што гналі, перыядычна даставалі пляшку з кішэні і выпівалі, відаць, каб быць смялейшымі. Заганялі адну партыю мужчын, вярталіся за новай.

У Борках, акрамя Марыі Лiхван, выратавалася яшчэ некалькі жанчын. У некаторых мужы былі ў палоне яшчэ з часоў нямецка-польскай вайны. І яны пастараліся выдаць іх за тых, хто па сваёй волі паехаў працаваць у Германію. Часам гэты прыём спрацоўваў. У Марыі Хамук муж трапіў у палон з польскага войска ў верасні 1939 года, і ўвесь час быў там. Яна, бяздзетная маладзіца, жыла ў сям'і з 13 чалавек. Ранкам і да іх паступалі. Свякроў Марыі нібы адчула ўсё, сказала: «Уставайце, дзеткі, гэта смерць наша...». Іх пагналі разам з усімі, пасадзілі ў агародзе. Потым прыходзілі немцы, браслі групу чалавек па 30 і гналі на могілкі на расстрэл. Калі дайшла чарга да сям'і Марыі, у агародзе ўжо засталося зусім мала людзей. Іх таксама пагналі на могілкі. І раптам пайшоў дождж, ды такі, што нічога не відаць стала. Але праз дождж, калі заўважылі кучы адзення, падумалі, што гэта забітыя людзі, аднавяскоўцы. А як падышлі бліжэй, то жахнуліся: убачылі вялікую групу людзей зусім раздзетых, іх гналі да ямы голымі.

Раптам немцы спыніліся і спыталі ў іх, з новай партыі, у каго ёсць пашпарты. Іх мала хто ўзяў, але людзі пачалі шукаць дакументы па кішэнях, выйшла замінка. Марыя тым часам стала гаварыць, што яе муж у Германіі. Немец спытаў, ці ёсць ад яго пісьмы. Яна адказала, што ёсць, хоць насамрэч іх не было. Тады немец пасадзіў яе пад сасной і загадаў чакаць. А тых людзей, якіх гналі разам, пазабівалі на яе вачах.

Яшчэ адна жанчына, Яўхіма Баланцэвіч, таксама была салдаткай, жонкай палоннага. І яе пасадзілі пад сасну, у яе і пашпарт з сабой аказаўся. Яе пакінулі, а сваякоў забілі. А муж, калі даведаўся пра лёс сям'і і вёскі, змог уцячы з нямецкага палону, прымкнуў да партызанаў, потым уступіў у рады Савецкай Арміі і загінуў у баі з фашыстамі.

Агапа Сергіевіч абхітрыла карнікаў. Калі прыгналі на злашчасны агарод, сказала вартавому, што ў яе дома засталося двое малых дзяцей, і яна хоча іх забрацць. Яе адпусцілі з патрулём. Але ў вёсцы яна змагла адарвацца ад сваіх канвойнага і ўцячы, уратаваць і сябе, і хлопчыка. Аднак выйшлі з пекла адзінкі.

### ДВАЙНЯТЫ ПРАЖЫЛІ МЕНШ ЗА СУТКІ

Тацяна Паўчалюк так і не выпусціла з рук двухгадовага Ванечку — упала, прыкрываючы яго сваім целам. Побач з ёю ўпалі, падкошаныя кулямі, сям-

# ГЭТА СМЕРЦЬ НАША!»

## палала каля паўсотні вёсак

Каля помніка ў вёсцы Боркі.

Фота з Telegram-канала «Матэрыяла «Голас часу».

наццацігадовая дачка Марыя, чатырнаццацігадовы Васіль, дванаццацігадовая Настасся, васьмігадовая Фёкла. А ў іншай сям'і нарэшце-рэшт, раніцай жа былі забітыя разам з усімі.

Расстрэл пачаўся ў 9.00, а скончыўся ў 18.00. Было забіта 705 чалавек, з іх — 372 жанчыны і 130 дзяцей. Вёска была разрабаваная і спаленая. Пазней у справаздачы камандзір 10-й роты 15-га паліцэйскага палка обер-лейтэнант Мюлер пісаў, што ўсе жыхары вёскі былі загоплены і дастаўлены да месца збору без усякіх здарэнняў. Добра дапамагло тое, што мэта сходу была невядомая. Мюлер паведамляў: «Пры правядзенні аперацыі сраскодавана: вінтовачных патронаў — 786 штук, патронаў да аўтаматаў — 2496 штук».

Яшчэ карнік прывозіць колькасць нарабаванага: «45 коней, 250 кароў, 65 цялят, 450 свіней, 300 авец. Забрана таксама 70 падвод, 200 плугоў і барон, 5 веялак, 25 саломарэзак і іншае. Усё канфіскаванае збожжа, інвентар, скаціна былі перададзены кіраўніку дзяржаўнага маёнтка Макраны. Страт у роце не было, — дадае Мюлер. — Адзін вахмістр з падазрэннем на жаўтуху адпраўлены ў шпіталь у Брэст». Справаздача сярод іншых дакументаў змешчана ў кнізе «Памяць. Маларыцкі раён».

Ва ўспамінах Марыі Лiхван было сведчанне і аб чалавеку праяве ў асяроддзі азвярэлых забойцаў. Адзін немец моцна плакаў: то выходзіў на вуліцу, то вяртаўся. Пра слёзы таго немца згадвала і Яўхіма Баланцэвіч: «Адзін немец зайшоў дахаты і літаральна заломваў рукі. Як паглядзіць на людзей, паківае галавой, адвернецца і хустачкай выцірае. І гэта ўсе бачылі. У нейкі момант ён не вытрымаў, выйшаў у сені і ўпаў. І калі заўважылі гэтую слабіну, кіраванне павезлі на легкавой машыне ў Брэст.

Нельга было, каб іншыя салдаты бачылі праяўленне шкадавання на твары нямецкага салдата». А ўсім было аб'яўлена і адзначана ў справаздачы, што салдат захварэў і быў тэрмінова шпіталізаваны.

Як высветліцца, няпраўду напісаў у справаздачы обер-лейтэнант Мюлер: падначаленыя не па падазрэнні на жаўтуху былі адпраўленыя ў Брэст, а па падазрэнні на чалавецькасць. А гэта ў захопніка нязвыклася слабасцю і прыраўноўвалася да немачы. У справаздачы яшчэ шмат звестак пра «Дзеянні ў вёсцы Боркі» — дакумент пазней стане адной з падстаў для абвінавачання на Нюрнбергскім працэсе.

У студзені 1943 года на Варонежскім фронце войскамі Чырвонай Арміі былі захопленыя дакументы 3-га батальёна 15-га паліцэйскага палка, у тым ліку «Журнал баявых дзеянняў» гэтага батальёна. Так дакументы трапілі на разгляд сусветна вядомага судовага разбору.

У дзень 80-годдзя трагедыі да помніка ў Борках прыйшлі вучні і настаўнікі Макранскай сярэдняй школы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, моладзь. Пра падзеі таго страшнага дня на мітынгу згадалі першы сакратар раённай арганізацыі БРСМ Марыя Горнік, дырэктар Макранскай школы Валянціна Літвін, настаўнік гісторыі Аляксандр Пiпко. Хвілінай маўчання ўшанавалі прысутныя памяць расстраляных жыхароў вёскі, усклалі да помніка кветкі.

Сучаснікі прыходзяць да ўсіх помнікаў тых страшных падзей. Прыходзяць сказаць сваё рашучае «не» войнам і забойствам, прыходзяць таксама, каб памаўчаць, падумаць, згадаць, прыхадзіць, каб ліхое больш не паўтарылася.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпавяднасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 11 ноября 2022 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объектов недвижимости – здания столовой и насаждений ограниченного пользования, принадлежащих открытому акционерному обществу «Гомельский завод станков и узлов» на праве собственности

**Лот № 1**

**Столовая, инв. № 350/С-194427.** Назначение: здание специализированное для общественного питания. Двухэтажное кирпичное здание, 1969 года постройки. Общая площадь 758,8 кв. м. Составные части и принадлежности: погреб, навес, асфальтобетонное покрытие, забор, забор.
**Насаждения ограниченного пользования** (инв. № 14964): клен по схеме № 309, акация по схеме № 310, акация по схеме № 311, акация по схеме № 312, акация по схеме № 313, акация по схеме № 314, акация по схеме №3 15, акация по схеме № 316, клен по схеме № 317, клен по схеме № 318, береза по схеме № 319, береза по схеме № 320, береза по схеме № 321 (13 ед. по 1 шт. каждая).
**Местонахождение объектов:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Иногородняя 8-я, 1/4

**Начальная цена лота: 159 309,76 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 15 000,00 руб.** (в т. ч. НДС по ставке 20 %)

Земельный участок для обслуживания здания столовой на праве постоянного пользования площадью 0,1450 га с кадастровым номером 340100000003003669. **Имеются ограничения (обременения) прав** на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), площадь 0,1450 га, и расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0026 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 09 ноября 2022 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **11 ноября 2022 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 11.10.2022 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 3 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объектов.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47. Сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by. Продавец: ОАО «ГЗСиУ», г. Гомель, ул. 8-я Иногородняя, 1, тел.: 8 (0232) 27-26-18; 8 (029) 115-43-71.**


Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА


### ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГОЛХУ «Осиповичский опытный лесхоз», 213765, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 12, тел. +375 2235-51805** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника, бывшее в употреблении**

| Лот, № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01250056 | **Автомобиль легковой специальный седан** LADA 21703, 2011 г. в., рег. знак. ЕВ-6 3075, № кузова XTA217030C0337634 | 3 108,00 |

Шаг электронных торгов составляет пять процентов от начальной цены предмета электронных торгов (по каждому лоту)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390. **Срок внесения задатка по 25.10.2022 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 26.10.2022.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **25.10.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 11.10.2022 г.**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность в Каменецком районе, Брестской области

| № лота | Наименование объекта/ адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **аг. Видомля, ул. Октябрьская, 20А** (площадь застройки 153 кв. м, погреб) и земельный участок | 12408080210 1000455 | 0,0759 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **12 316,87** (10 145,04 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 2 171,83 – земельный участок) | 2 400,00 | **1 849,45** | 0,0055 га – охранная зона газораспределительной системы (газопровод низкого давления) | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение, канализация |
| 2 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **аг. Видомля, ул. Школьная, 48** (площадь застройки 49 кв. м, сарай, беседка, уборная) и земельный участок | 12408080210 1000476 | 0,2275 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **10 254,59** (6 296,09 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 3 958,50 – земельный участок) | 2 000,00 | **1 087,79** | 0,0107 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| 3 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **аг. Турна Большая, ул. Парковая, 2** (наружная площадь 164 кв. м, готовность 10 %) и земельный участок | 12408080910 1000432 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **9 622,45** (4 852,45 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 4 770,00 – земельный участок) | 1 900,00 | **1 643,34** | 0,1500 га – расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов); 0,0123 га – охранная зона электрических сетей; 0,0123 га – охранная зона объектов газораспределительной системы | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| 4 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **аг. Турна Большая, ул. Советская, 31** (улучшения – сарай, площадь 68 кв. м) и земельный участок | 12408080910 1000433 | 0,2469 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **13 363,28** (5 511,86 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 7 851,42 – земельный участок) | 2 600,00 | **1 615,98** | 0,2469 га – расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов) | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| 5 | Не завершенный строительством законсервированный одноквартирный жилой дом с инв. № 125/U-14251 в **аг. Турна Большая, ул. Советская, 33** (наружная площадь 116 кв. м, готовность 12 %) и земельный участок | 12408080910 1000434 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **11 580,70** (3 630,70 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 7 950,00 – земельный участок) | 2 300,00 | **1 615,30** | 0,2469 га – расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов); 0,1500 га – охранная зона электрических сетей | Газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение |
| **Размер штрафа**, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **3 200,00 рублей** |

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92**

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00. 03.11.2022 г.**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за право заключения договора аренды земельного участка), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные местным бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

• в течение 2 месяцев со дня получения протокола в установленном законодательством порядке осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав ограничений (обременений) прав на него;

• в течение одного месяца с момента осуществления государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке, проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома и согласовать ее;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 10 ноября 2022 г. в 11.00 по адресу: Каменецкий район, аг. Видомля, ул. Школьная, 4.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 11.10.2022 г. до 16.00. 03.11.2022 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.kamenec.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ И ПРЕДМЕТЕ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов – комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, Продавец – Белорусский государственный университет,**

**Оператор электронной торговой площадки – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», электронный адрес электронной торговой площадки – https://et.butb.by**

| Дата электронных торгов | Сведения о предмете электронных торгов | Местонахождение имущества | Начальная цена, руб. | Информация о публикации извещения |
|---|---|---|---|---|
| 27.10.2022 | **ЗДАНИЕ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЕ КОММУНАЛЬНОГО ХОЗЯЙСТВА (насосная станция 1 подъема), 193,9 кв. м, с хозяйственно-бытовой канализационной сетью.** Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0634 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах электронных торгов либо признании электронных торгов несостоявшимися | г. Минск, ул. Макаенка, 19Б | 61 045,02 | Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на **https://au.nca.by/item/1250517** и **https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda** |

УНП 100048181

# ПРАВА НА ТРАЎМУ

## Дайсці да дна, каб... адштурхнуцца і рухацца наверх

**Кожны з нас сутыкаецца ў жыцці са стратай блізкіх, работы, буйной сумы грошай ці праблемамі са здароўем. І ў кожнага з нас свая рэакцыя на такія падзеі. Ці ёсць правілы, якія аблягчаюць такія перажыванні? Як правільна расставацца з людзьмі? Ці варта перажываць з-за страты работы? Чым дапамагчы, калі твае блізкія аддалі грошы махлярам? Пра гэта і іншае гутарым з псіхолагам Марыяй ГУЦЬКО.**

### ПРЫНІЖЭННЕ, ПАДМАЦАВАНАЕ МАТЭРЫЯЛЬНЫМ ПАКАРАННЕМ

***— Марыя Яўгенаўна, ці можна вылучыць самыя траўмавальныя падзеі ў нашым жыцці?***

— Цяжка сказаць, якія падзеі самыя псіхатраўмавальныя, ці скласці іх у нейкі рэйтынг, бо ў кожнага з нас свая нервовая сістэма і эмацыянальны інтэлект. Хтосьці можа з простай сітуацыі зрабіць псіхатраўмавальную падзею, іншаму тое здаецца дробязю. Мы ўсе рэагуем на ўсё абсалютна па-рознаму, таму столькі паміж намі непаразумення. Для кагосьці псіхатраўмавальнай з'яўляецца сітуацыя, калі яму сказалі грубую фразу і не папрасілі прабачэння, іншы адчуе аналагічны эмацыянальны фон ад нейкай страшэннай знявагі з боку начальства, для трэцяга такі ж эмацыянальны крах будзе ад пазбаўлення яго прэміі.

**«Калі ў нас нармальная самаацэнка, нам не патрэбнае ацэньванне ад іншых. Калі я разумею, што я ім не патрэбны, то і мне не патрэбная работа з такім калектывам».**

Самая траўмавальная падзея, безумоўна, — смерць блізкіх. Па эмацыянальнай шкале страта свайго спадарожніка падчас скасавання шлюбу прыраўноўваецца да таго ж. Сюды ж можна прылічыць і проста расстанне маладых людзей. Падчас і смерці блізкага, і скасавання шлюбу, і расстання мы перажываем прыкладна аднолькавы эмацыянальны крах.

Аднак галоўнае — не шкала цяжкасцяў, з якімі нам прыходзіцца сутыкацца, а тое, наколькі вы адчувальны чалавек. Не ўсе мы аднолькавыя, ёсць вельмі высокаадчувальныя людзі. Яны такімі ўжо нараджаюцца, і такое дзіця будзе плакаць з-за любой дробязі, у яго няма ўстаноўкі: «Бачу мэту — не бачу перашкод», яно рэагуе на ўсё. Але, як правіла, менавіта такія людзі валодаюць выдатнай інтуіцыяй, сыходзяцца з любымі людзьмі, у іх добрая эмпатыя, таму нельга лічыць, што гэта нейкія няшчасныя людзі. І калі яны тое пра сябе зразумелі, усё ў іх у жыцці шыкоўна. Галоўнае, каб бацькі ў дзяцінстве не казалі, што «ты ў мяне «нейкі дэфектыўны», бо плачаш з-за ўсяго».

***— Цяпер нярэдкія выпадкі, калі ў пажылых людзей махляры выманьваюць грошы. Як правільна перажыць такую страту пажылым людзям і іх блізкім, якія за іх непакояцца?***

— Праблема вострая, і сапраўды людзі нярэдка звяртаюцца з ёй на працягу апошняга года. Рэакцыя ва ўсіх розная. Па псіхалагічных адчуваннях гэта прыніжэнне. Часта грошы знімаюць з крэдытнай карткі ці прымушаюць узяць крэдыт, і ты яшчэ павінен пэўны час кампенсаваць гэта. Прыніжэнне, падмацаванае матэрыяльным пакараннем, вельмі цяжка, але можна перажыць. Тут важна сказаць сабе, што ў жыцці я магу зведаць што заўгодна — і страту блізкіх, і страту грошай, але важна ведаць, як я на гэта рэагую. Я ўсё прайду, бо жыццё — не толькі радасць. Закрываючыся ад праблем, мы тым самым губляем частку сваёй асобы. Для гэтага і патрэбныя псіхолагі, яны дапамагаюць пазнаць сябе.

Зрэшты, у беларусаў ёсць вялікая цікавасць да псіхалогіі: паводле статыстыкі адной з кніжных інтэрнэт-крамаў, самыя топавыя запыты — літаратура па псіхалогіі. То-бок, многія імкнуцца сябе вывучыць, перастрахавацца. Ёсць у нас такая якасць: мы крыху не давяраем адзін аднаму, суседзям, банкам, а ўсё роўна пападаемся на хітрасці. Па маіх асабістых назіраннях, часта тое здараецца менавіта з людзьмі, для якіх характэрны гіперкантроль, якім важна, каб усё атрымлівалася, у іх не ўзнікае сумнення, што нешта не так. Нельга казаць, што гэта адкрытыя, наіўныя людзі.

Дык вось, у кожнага свае механізмы рэагавання. Камусьці трэба выплакацца і парыдаць, хтосьці шукае вінаватых, хтосьці сыходзіць у канфлікт, каб зняць напружанне, якое з'яўляецца, калі мы адчуваем стрэс. Самая горшая рэакцыя — гэта, напэўна, калі чалавек «замірае» на некалькі дзён ці тыдзень, каб назапасіць рэсурс ці прааналізаваць сітуацыю. Хутчэй за ўсё, у дзяцінстве такога чалавека бацькам было не да яго эмоцый, і ён прызвычаіўся, што эмоцыі забароненыя, калі яму дрэнна. Адпаведна, ён закрываецца, бо не давярае нікому са значных людзей. І толькі паступова, знаходзячы нейкі пункт апоры, пачынае бачыць рашэнне.

Спачатку мы заўсёды ўключаем прымітыўную частку сваіх эмоцый, і нічога новага не будзе, калі вы пабяжыце да псіхолага. Вы ўсё роўна павінны адплакаць тыдзень ці не есці тры дні.

У цэлым па жыцці мы ўсе адзінокія, нават у вялікіх сем'ях з моцнымі сувязямі. У такія хвіліны чалавек усё роўна адзін і яму ніхто не дапаможа. Трэба адплакаць, дайсці да дна, каб адштурхнуцца і рухацца наверх.

***— Як правільна размаўляць з махлярамі? Калі ты разумееш, хто табе тэлефануе, ці можна паіранізаваць, або лепш адразу скончыць размову?***

— Вядома, прывабна паказытаць нервы сабе і махляру. Але мы не заўсёды ведаем, наколькі далёка зайшлі тэхналогіі. Лепш адразу пакласці трубку.

***— Чаму тэлефонныя махляры часта абражаюць?***

— Бо ў іх практыцы часцей за ўсё абраза спрацоўвае. Калі чалавек напужаны, на жаль, многія з нас вядуцца, калі на нас яшчэ і прыкрыкнуць. Нехта ў шокавым стане ад гэтай абразы паддаецца на далейшыя ўлоўкі. Такая асаблівасць нашай ментальнасці. Псіхалагічны ціск і НЛП робяць сваю справу.

***— Колькі можа доўжыцца такое перажыванне?***

— Усё індывідуальна. З практыкі магу сказаць, што тыя людзі, якія год таму ў шоку выплачвалі ўкрадзеныя грошы ці аддавалі крэдыты, цяпер нармальна сябе адчуваюць. Калі нехта з імі жартуе на такую тэму, ім, вядома ж, балюча, але не так, як год таму. Калі чалавек без пачуцця гумару і пазітыўнага мыслення, то стрэс будзе працягвацца доўга. Але больш за два гады ніхто не пакутуе, і крэдыты за гэты час вяртаюць.

**«Настроіцца варта на тое, што як бы ні было балюча, усе стадыі гаравання заканчваюцца аднолькава: прыняццем. Можна адплакаць, адтаргавацца, аддэпрэсаваць, але пакуль мы не прымем сітуацыю, мы не супакоімся».**

У кожнай такой сітуацыі варта падумаць: што яна дала мне? Шмат гісторый, калі дзякуючы таму, што чалавек так папаўся, ён з кімсьці пазнаёміўся ў банку, набыў сябра, убачыў, хто прапанаваў дапамогу, а хто з яго пасмяяўся.

### СТРАТА СПАДАРОЖНІКА Б'Е ПА САМАЛЮБСТВЕ

***— Адна з самых моцных траўмавальных падзей — расстанне і скасаванне шлюбу. Як правільна іх перажываць? Ці варта цалкам прыбіраць з жыцця таго чалавека або лепш, наадварот, захаваць адносіны?***

— Асобны варыянт — выхад з аб'юзіўных адносін, калі цябе прыніжаюць і зневажаюць. Ён вельмі доўгі — людзі расстаюцца і зноў з'язджаюцца па некалькі разоў. Тады варта дайсці да таго дна, калі, нарэшце, адчуеце, што няма пра што шкадаваць. Бо дагэтуль вы ўвесь час сумняваецеся: вы ж абралі гэтага чалавека, вам жа было добра, вас усё задавальняла. Людзі ў такіх адносінах быццам бы пад гіпнозам ці ім нібы ўкалолі абязбольвальнае: адчуваюць, што ім дрэнна, з іх здзекуюцца, але яны не сыходзяць, бо ва ўсім вінавацяць сябе. З такіх адносін складана выходзіць, але людзі потым шчасліва жывуць і кажуць: «Аказваецца, за маю свабоду варта было пазмагацца шмат гадоў, пакуль мы расставаліся-сустракаліся».

Калі скасаванне шлюбу было натуральным — хтосьці здрадзіў ці разлюбіў, — вядома, лепш прыбраць усё лішняе і старацца не сустракацца з гэтым чалавекам. Так, гэта страта, якая б'е па самалюбстве, нашай упэўненасці. Варта звяртацца да псіхолага і працаваць над сваёй самаацэнкай, шукаць пункт апоры. Няма ўніверсальных парад, адзін метад падыдзе аднаму чалавеку і зусім не падыдзе іншаму. І не заўсёды людзі бачаць, што гэта аб'юзар.

***— А якая прыкмета? Тое, што табе дрэнна ў гэтых адносінах?***

— Вам дрэнна, у вас няма ні сяброў, ні сябровак, ні таго атачэння, якое калісьці было, ні нават бацькоў. Плюс усе кажуць: ты так змяніўся ці змянілася, стала сур'ёзнай, зусім не ўсміхаешся. Усё вакол цябе расталося, ёсць толькі адзін чалавек і з ім 24/7 трэба праводзіць час.

***— Каб канчаткова не ўпасці ў дэпрэсію, як пасля расстання пазбавіцца ад навязлівых думак?***

— Сказаць сабе, што заўтра будзе лягчэй. І даць выхад эмоцыям. Асабліва людзям, у якіх добра развітая эмацыянальная частка і багатае ўяўленне. Уявіце ўсе самыя горшыя сцэны: што вы застанеце адна з катом, старая без зубоў, непрыгожая бабуля, усімі пакінутая... Раскруціце гэту кінастужку да самага страшнага канца, якога так баіцеся. І калі сапраўды адчуеце сябе той кінутай бабуляй, якая ляжыць у ложку, прыходзіць разуменне, што ўсё добра і я пакуль маладая! Трэба толькі дазволіць сабе жыць.

Калі мы гаворым пра стрэс і траўмавальныя сітуацыі, першае, што варта ўспомніць, — пра сваё цела. І пра тое, што цяпер вы хворы, бо стрэс — таксама хвароба, гэта напружанне мышцаў, церпіць наша псіхасаматыка. Таму карысныя любыя цялеснаарыентаваныя практыкі: дыханне, басейн, проста легчы на падлозе і згадаць дзве позы ёгі, якія вам падабаюцца. Гэта дае адчуванне ўласнага цела: тут пабольвае, там цягне. Дыханне — простыя практыкаванні, але мала хто спачатку можа зрабіць іх правільна. Хутка ўдыхаем праз нос і павольна-павольна выдыхаем праз рот. Наступны этап — удыхаем праз нос і надзімаем жывот, а потым мякка стараемся яго здуць праз рот. Любая дыхальная практыка падыходзіць.

**«Галоўнае — не шкала цяжкасцяў, з якімі нам прыходзіцца сутыкацца, а тое, наколькі вы адчувальны чалавек. Не ўсе мы аднолькавыя, ёсць вельмі высокаадчувальныя людзі».**

Выздараўленне ідзе марудна, таму тут варта не здавацца, працягваць цялеснаарыентаваныя практыкі. І мяняць вакол сябе прастору. Дзяўчына не проста мяняе стрыжку — з ёю мяняецца жыццё. Вы кожны раз глядзіцеся ў люстэрка і бачыце, што да гэтай стрыжкі не пасуе старая памада, акуляры не падыходзяць, да стрыжкі хочацца дадаць нешта брутальнае ў аблічча. І мы незаўважна мяняемся, дзякуючы новаму адценню памады, перастаўленай у кватэры мэблі, новым туфлям.

***— Як зразумець, што пачынаецца дэпрэсія?***

— Вам не хочацца ісці на работу, не хочацца кантактаваць з людзьмі, усміхацца, вы прымушаеце сябе ўставаць з ложка і хоць штосьці зрабіць. Калі немагчыма ўстаць, ты ляжыш і адмяняеш усё: і адзін дзень, і другі, і трэці, гэта сведчыць, што варта ісці да спецыяліста.

### ДАЙЦЕ САБЕ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

***— Наколькі траўматычная такая падзея, як страта работы? Ці варта з-за гэтага ўвогуле перажываць?***

— Можна і паплакаць, калі работа сапраўды была добрая і здарылася нечаканае звальненне. Нечаканая падзея заўсёды становіцца траўмавальнай. Зноў жа, усе мы рознія, і рэакцыя наша адрозніваецца. Інтраверту варта пасядзець аднаму, паплакаць, нікому ні пра што не расказваць. Экстраверту варта ўсім патэлефанаваць, атрымаць падтрымку калег, ён так папаўняе свой рэсурс.

**«У кожнага свае механізмы рэагавання. Камусьці трэба выплакацца і парыдаць, хтосьці шукае вінаватых, хтосьці сыходзіць у канфлікт, каб зняць напружанне, якое з'яўляецца, калі мы адчуваем стрэс».**

Аднак ніхто за вас не перажыве гэта. Настроіцца варта на тое, што як бы ні было балюча, усе стадыі гаравання заканчваюцца аднолькава: прыняццем. Можна адплакаць, адтаргавацца, аддэпрэсаваць, але пакуль мы не прымем сітуацыю, мы не супакоімся. Калі мяне звольнілі, значыць, я ім не патрэбны. Я заўсёды раю задумацца: калі вы там не патрэбныя, навошта вы б'яцеся ў гэтыя дзверы? Калі вам сказалі, што вы не патрэбныя, гэта не сведчыць пра тое, што яны лепшыя, а вы горшы. Проста таму калектыву, той брыгадзе ці офісу вы не падыходзіце.

Калі ў нас нармальная самаацэнка, нам не патрэбнае ацэньванне ад іншых. Калі я разумею, што я ім не патрэбны, то і мне не патрэбная работа з такім калектывам. Калі мяне звольнілі за тое, што я дрэнна пісаў даклады, а даклады пісаць — увогуле не маё, то навошта біцца ў гэтае шкло? Я не люблю пісаць даклады, затое выдатна раблю аналітыку, магу прымяніць творчы падыход, але чамусьці імкнуўся перарабіць сябе пад тых людзей, якія там працуюць.

***— Калі раптам узнікаюць праблемы са здароўем, як з імі змірыцца?***

— Як і ў сітуацыі са стратай грошай, мы сутыкаемся з гэтымі праблемамі, не ведаючы і не чакаючы, што такое магчыма. Варта ўявіць усё самае страшнае, як вы застаяцеся без блізкага, а потым усё можа аказацца не так страшна і захворванне лечыцца. Адплакаць усё роўна варта. Трэба накіраваць сваё цела на рухальную актыўнасць — выйсці на прабежку, хадзіць пешшу да болі ў нагах, у целе. Гэта перанос унутраных перажыванняў на вонкавы боль. Дзесьці і слёзы дапамагаюць. Я заклікаю мужчын выпусціць гэту адну слязу — стане лягчэй.

Памятайце, любая траўмавальная сітуацыя скончыцца, таму важна мозг і цела захаваць у здаровым стане.

**Алена КРАВЕЦ.**

Рэха падзеі

# ПОЛАЧЧЫНА ГІСТАРЫЧНАЯ

**САМЫ старажытны горад Беларусі адсвяткаваў 210-годдзе вызвалення ад напалеонаўскіх войскаў у гады вайны 1812 года. Мы даведаліся, чым былі насычаныя тры дні культурна-асветніцкай праграмы.**

Даты правядзення маштабных урачыстых мерапрыемстваў на Полацкай зямлі былі абраны невыпадкова: гісторыкі сведчаць, што менавіта ў пачатку лістапада тут вяліся жорсткія вызваленчыя баі.

Старт падзеі далі краязнаўчыя тэматычныя чытанні «Спадчына Полацкай зямлі» ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку. Свае навуковыя работы прадставілі навучэнцы школ і гімназій горада, іх даследаванні ўвойдуць у зборнік, які плануецца апублікаваць у пачатку наступнага года. Загадчык Полацкага краязнаўчага музея Ірына Воднева адзначыла, што выступленні моладзі прайшлі на высокім узроўні, бо да канферэнцыі дзеці разам з навуковымі кіраўнікамі складалі экскурсійныя маршруты, вывучалі навуковую літаратуру, таму кожная работа мае права ўвайсці ў агульны зборнік. У сваіх выступленнях удзельнікі ўспаміналі і рускага палкаводца, героя вайны 1812 года генерал-маёра Якава Кульнева. 19 ліпеня ў Клясіцкім баі ён узяў 900 палонных французаў, пераправіўся праз Дрысу, а потым быў смяротна паранены.

Вечарам першага ўрачыстага дня ў зале мясцовага загса прайшоў першы ў гісторыі сучаснага Полацка баль. Як расказала **галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Полацкага райвыканкама Марыя ПЯТРОЎСКАЯ,** такое мерапрыемства — дэбют. У ім узялі ўдзел 25 пар — афіцэры воінскіх часцей, на-

вучэнцы Полацкага педагагічнага каледжа, гараджане, якія на працягу месяца разам з харэографам адточвалі вальс, паланэз, польку, галоп. У перапынках паміж танцамі ўдзельнікі балю змагаліся ў гульнях пачатку XIX стагоддзя.

Аб ролі вайны 1812 года ў станаўленні Полацка расказалі 7 кастрычніка на публічнай лекцыі ў Полацкім дзяржуніверсітэце. Менавіта 7 кастрычніка рускія войскі пачалі штурм гарадскіх умацаванняў і хутка завалодалі імі. 8 кастрычніка 1812 года горад быў вызвалены ад напалеонаўскіх войскаў. У баях за Полаччыну загінула каля сямі тысяч рускіх салдат, страты французаў былі прыкладна такія ж. Акрамя таго, 50 афіцэраў і звыш дзвюх тысяч салдат былі ўзяты ў палон. Горад падчас акупацыі быў разгромлены: у 1817-м у ім налічвалася толькі 3340 жыхароў.

Вечарам у сценах універсітэта прайшоў канцэрт класічнай музыкі XIX стагоддзя, пляцоўка для яго правядзення была абрана невыпадкова: столькі ж гадоў споўнілася са дня адкрыцця Полацкай акадэміі — першай вышэйшай навучальнай установы на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Са сцэны гучалі музычныя творы сусветных кампазітараў — Франца Шуберта, Голанда, Гласа Філіпа, Міхаіла Ельскага. Эмоцыі гледачам дарылі камерны аркестр «Еўропа-цэнтр», педагогі і навучэнцы мясцовай дзіцячай школы мастацтваў, Наваполацкага музычнага каледжа, капэла педагогаў Полацкага каледжа імя П. М. Машэрава, а таксама народны ансамбль музыкі «Віяліна».

У трэці святочны дзень арганізатары прадставілі экскурсійныя маршруты па знакавых мясцінах вайны 1812 года і пазнаёмілі ўсіх жадаючых з галоўнымі аб'ектамі: Чырвоным мостам, помнікам вайны 1812 года, мемарыяльным комплексам «Урочышча «Пяскі», дзе па дакументальных пацвярджэннях ішлі кровапралітныя руска-французскія баі, пахаваннем удзельнікаў французска-рускай вайны ў вёсцы Калектыўная.

Кульмінацыяй урачыстых мерапрыемстваў стала маштабная рэканструкцыя боя за Полацк з удзелам ваенна-гістарычных клубаў Беларусі і Расіі. У гэты раз яны вярнулі палачан і гасцей горада да падзей, якія называюць «эпохай апошняй прыгожай вайны».

У рэканструяваным баі ўзяло ўдзел каля 40 чалавек — гэта прадстаўнікі клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Фузілеры-грэнадзёры Імператарскай Гвардыі» з Мінску, «Беларускі гусарскі полк», «6-ы егерскі полк» з Санкт-Пецярбурга, а таксама прадстаўнікі клуба «Санкт-Пецярбургскае апалчэнне» і аб'яднання клубаў «Барысаўскай рэканструкцыі пехацінцаў».

Сярод прысутных былі і жанчыны — аматаркі гісторыі. Так, Таццяна Богуш прыехала з Мінска, у рэканструкцыі іграла ролю гандлёўкі прыпасамі, якая ішла за войскамі французскай арміі. У захапленні гістарычнай тэматыкай ёй дапамагае спецыяльнасць: Таццяна займаецца шыццём, свой касцюм стварыла сама, дапамагае з гэтым і іншым удзельнікам.

На вачах публікі разгарнулася цэлая баталія, і, нягледзячы на тое, што патроны былі халастымі, а ядры замяняла піратэхніка, эмоцыі ад перамогі былі сапраўднымі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота Ілыі ШВЯДКО.**

Час і норавы

# ІМПЕРАТАР ДЗЯКАВАЎ ЗА ПРАЎДАЛЮБСТВА

## Як разбіраліся справы ў сярэдзіне XIX стагоддзя

**У 1804 годзе ў маляўнічы маёнтак Лапічы на беразе Свіслачы карэта віцэ-губернатара толькі што створанай Магілёўскай губерні, стацкага саветніка Івана Акімавіча Ламачэўскага, даставіла маладзенькую цяжарную кабету, яго жонку. Тут, у Лапічах, жылі яе бацькі. Неўзабаве на радасць ім і ўсёй сям'і на свет з'явіўся хлопчык, якому пры хрышчэнні святар прапанаваў даць імя Асінкрыт (непараўнальны) ў гонар святога, якога вызначалі адказнасць і самаахвяраванне ў адносінах да сяброў сям'і і любімых.**

Дакладна вядома, што бацька Асінкрыта меў сваю пасаду ўсяго два гады, і ў год нараджэння сына знік з рэестра высокіх чыноўнікаў, верагодна, памёр ад хваробы ці ран, і, можна меркаваць, маладзенькая ўдава, пазбавіўшыся сродкаў, адна гадавала сына. Аднак праз пэўны час у яе адшукаўся, мабыць, уплывовы заступнік, бо Асінкрыцік з Лапіч апынуўся ў Паўлаўскім імператарскім ваенна-сіроцкім доме ў Санкт-Пецярбургу. Для сям'і з глухой правінцыі гэта была па тым часе неверагодная ўдача!

Асінкрыт не згубіўся ў згаданай кадэцкай вучэльні, паказваў стараннасць, і ў час выпуску класа ў 1825 годзе яму (адзінаму з равеснікаў) было прысвоена першае афіцэрскае званне прапаршчыка. Ён рукавеў перад строем, калі начальнік зачытаў аб гэтым царскі ўказ і ўручыў эпалеты з першай зарачкай. Між тым, невядома з якой прычыны, пачала ўзыходзіць і яго жыццёвая зорка: праз месяц былы сірата з Лапіч быў залічаны ў Світу Яго Імператарскай Вялікасці (зноў жа, выключны выпадак!) і пайшоў угару: служба пры Віленскім і Мінскім ваенным губернатары, у Галоўным штабе і г. д.

Калі і дзе Асінкрыт сустрэў сваё каханне, не ўстаноўлена, але тое, што яго жонка, Аляксандра з Уладзімірцавых, узмацняла станоўчыя якасці мужа — гэта дакладна: паслядоўна ў шчаслівай сям'і нарадзілася 17 дзяцей! І што найбольш дзіўна, усе яны, цяпер ужо з даволі нябеднага сямейства, вучыліся за дзяржаўны кошт у элітных вучэльнях, а хросным бацькам у іх быў сам імператар! Службоўцаў у званні Асінкрыта ў імператара была процьма, чаму ж тады менавіта яму аказваўся выключны гонар? Мо справа ў жонцы? Якая таямніца звязвала Мікалая I і сям'ю Асінкрыта Іванавіча Ламачэўскага з беларускіх Лапіч? Цытую дакумент: «...в июле 1836 года император изъявил согласие на восприятие от купели дочери Александры (першае дзіця, дарэчы) и пожаловал супруге в подарок...». Ну, што яшчэ мог дарыць цар нерадавітай дваранцы — рэчы, якія сёння ёсць не ў кожным даведніку: «бриллиантовый фермуар» (накшталт сучаснай сумачкі-касметычкі ў брыльянтах), «бриллиантовый аграф и сен-сесиль» (брошка і ювелірны вянец у брыльянтах на прычоску), а пра завушніцы з брыльянтамі за двойню (дзеці Мікалай і Варвара) і тлумачыць не трэба. Не, Мікалай I не быў скупы на адносна падарункаў, але ўсё ж... Жонцы малодшага афіцэра — фермуар?..

Разам з падарункамі рухалася і служба. У 1837 годзе Асінкрыт пераводзіцца з войска на цёплае месца ў корпусе жандараў і з'яўляецца ў Мінску ў якасці жандарскага штаб-афіцэра — паўнамоцнага прадстаўніка імператара ў губерні. У яго функцыях кантроль за выкананнем законаў, праверка дзеянняў чыноўнікаў незалежна ад пасады і, калі неабходна, непасрэдны даклад цару.

Пазней у шматлікіх мемуарах (як польскіх, так і расійскіх) сучаснікі адзначалі выключную аб'ектыўнасць Ламачэўскага пры разборы спраў як у складзе камісій, так і самастойна. Асаблівую павагу выклікала яго выкрыццё чыноўных замахаў на асуджэнне групы ні ў чым не вінаватых 70 чалавек. Усе датычныя да здзеку чыны былі зволены са службы, а імператар за праўдалюбства падзякаваў Ламачэўскаму ордэнам (падрабязна пра гэта Асінкрыт Іванавіч напісаў у сваіх мемуарах).

Аўтарытэт яго быў настолькі высокім, што неаднойчы імператар даручаў яму расследаванне такіх спраў, якіх пазбягалі іншыя. Вось прыклад.

Звярнуліся да яго неяк два родныя браты Вячэрскія, сяляне памешчыка Гарноўскага з вёскі Лючцы Лепельскага павета. Яны сцвярджалі, што іх гаспадар злачынец, які закапаў жывымі дзвюх сваіх сялянак, а перад тым забараніў ім выходзіць замуж, пакуль не ахвяруюць яму сваю нявіннасць. А раней быў выпадак, калі дзве дзяўчыны памерлі ад такой ахвяры, бо былі малалетнімі.

У Ламачэўскага мелася імператарскае даручэнне, і ён са світай выехаў у Лепель. На месцы ж зразумеў, што мінулыя следчыя пазбягалі гэтай справы з-за яе выключнай пікантнасці.

Допыт Гарноўскага чыніўся ў прысутнасці сведкаў. Абвінавачаны паказаў, што сапраўды даў загад закапаць у зямлю без трун дзвюх сялянак, памерлых ад халеры, паколькі іх радня баялася хваробы і прасіла спіхнуць памерлых у яму палкамі. Адносна таго, што дзве дзяўчыны памерлі быццам бы ад насілля і пабояў, ён паказаў, што яны не былі малалетнімі, і адна памерла ў дзевятнаццаць, а другая — у дваццаць гадоў.

З усіх сялянак Гарноўскага толькі адна, абараняючы памешчыка, абазвала прысутных несумленнымі і сказала: «Ды хто ж з вас неахвотна з'яўляўся да халастога пана, які за паслугу заўсёды даваў гасцінцы?» Некаторыя жанчыны сапраўды скардзіліся на Гарноўскага не за тое, што вымушаны былі плаціць даніну «ахвяравання», а за тое, што ён вельмі доўга вытрымліваў іх у чаканні шлюбнага вянца. Іншыя абвінавачвалі яго ў цынізме і бесцырымоннасці абыходжання з імі дзе і як папала сярод белага дня, што ўласціва толькі зверу.

Гарноўскі не абвяргаў іх слоў, падпісваў паперы, а ў выніку справа завяршылася ўстанаўленнем апекі над яго ўладаннямі. Рабаўладальнік пазбавіўся і рабынь, і ўласнасці.

У 1843 годзе Асінкрыту Іванавічу прапанавалі заняць крэсла паліцмайстра Санкт-Пецярбурга. Ён пагадзіўся з неахвотай, бо сям'і належала перабірацца ў сталіцу, а жылля пакуль не было. З іншага боку, належала вучыць дзяцей, і лішнія грошы не заміналі. Праўда, калі б ён ведаў, чым павернецца высокае прызначэнне, то не надта ірваўся б з Мінска.

Адным з няпісаных «абавязкаў» сталічнага паліцмайстра была гульня ў карты. Пазбегнуць яе азначала быць адсунутым ад свецкага жыцця і кола асоб, якія ўплывалі на службовы рост. Між тым, гульні «на інтарэс» былі забароненыя. Як згадваў пазней Асінкрыт Іванавіч, яму і ў галаву не магло прыйсці, што ў дамах прыдворнага кампазітара Танеева, члена Санкт-Пецярбургскага Англійскага сходу, масона Глінкі і іншых, дзе гулялі ў карты ў коле заслужаных генералаў, сенатараў, членаў Дзяржсавета і наогул людзей пры пасадах, яго маглі чакаць вялікія непрыемнасці.

Здарылася ж так, што адзін з карцёжнікаў, таксама вядомы чалавек, пачаў прайграваць, але значныя даўгі вяртаў своечасова. Усе дзівіліся і сышліся на тым, што яму, відаць, перапала багатая спадчына за жонкай. Аказалася, што чалавек залез у дзяржаўную кішэню. Узнікла следства. Імператар загадаў усіх, хто меў дачыненне да гульняў, аддаць пад суд. Вінаваты быў «раскулачаны» і адпраўлены ў арыштанцкую роту, іншыя атрымалі пяцізначныя штрафы. Ламачэўскага ж з трэскам звольнілі з паліцмайстраў за парушэнне этыкі і недагляд, з забаронай займаць адпаведныя пасады. Ён зноў апынуўся ў Мінску, дзе карысна працаваў на пасадзе старшыні Мінскай казённай палаты, быў мінскім губернскім паштмайстрам, а завяршыў свой шлях міравым пасярэднікам Ігуменскага павета ў 1884 годзе. Быў пахаваны на Ігуменскіх гарадскіх могілках.

У мемуарах, якія друкаваліся ў перыядычным друку пры жыцці аўтара, і ў асобнай кніжцы Асінкрыт Іванавіч Ламачэўскі згадвае падзеі, што адбываліся на беларускай зямлі ў часы Пушкіна. Гэта каштоўная крыніца для краязнаўства.

**Віктар ХУРСІК.**

Гісторыя ў асобах

# «ПЕРАД БОЕМ БАЙЦОЎ ТРЭБА БЫЛО НЕЯК НАТХНІЦЬ»

## Па старонках біяграфіі дырэктара Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Міхаіла Бергера

**Калі рыхтавала матэрыял пра франтавыя беларускія канцэртныя брыгады, увесь час сутыкалася з дакументамі, датычнымі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, сённяшняй Акадэміі музыкі... 28 чэрвеня 1941 года дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Прагін і дырэктар Дзяржаўнай беларускай кансерваторыі Міхаіл Бергер атрымалі аднолькавыя пасведчанні.**

*«Центральный комитет коммунистической партии (большевиков) Белоруссии.*
*№ 447 28/VI-1941г.*
*Удостоверение*
*Центральный комитет КП(б) Белоруссии поручает тов. Бергеру работу по организации эстрадно-театральных бригад для художественного обслуживания частей действующей Красной Армии».*

Прагіна прызначылі дырэктарам франтавой канцэртнай брыгады, Бергера — мастацкім кіраўніком. Ён жа быў і канцэртмайстрам.

Сёлета Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі святкуе дзевяностагоддзе. З гэтай нагоды ўспамінаюцца славутыя імёны з яе гісторыі. Давайце ўспомнім і мы — з дапамогай дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

### Сын мінскага краўца

У архіве ёсць дзве аўтабіяграфіі Міхаіла Бергера, напісаныя ад рукі.

*«Родился в 1909 году, в семье рабочего закройщика в гор. Минске. С 1922 года, обучаясь в муз. школе и музык. училище одновременно работаю в минских театрах, клубах — как пианист, солист и аккомпаниатор. А в 1928 году оканчиваю музык. техникум, после чего поступаю в Ленинградскую консерваторию».*

Калі сын мінскага закройшчыка, краўца вучыўся ў мінскім музычным тэхнікуме, там выкладаў паэт Язэп Пушча. У 1927-м Пушча перадаў сваё месца паэту Уладзіміру Жылку, які толькі прыехаў з Заходняй Беларусі і меў патрэбу ў рабоце. Так што Міхаіл Бергер мусіў з ім сустракацца. Жылка закахаўся ў студэнтку тэхнікума Рыму Маневіч, якой у 1928 годзе, калі студэнт Бергер давучваўся, прысвяціў верш «Каханню нічога не трэба». Гэта каб вы ўявілі атмасферу таго часу — беларуская культура віравала ад маладых талентаў: творчыя вечары, дыскусіі...

Міхаіл быў вельмі таленавіты. Знайшла згадку, што ў дзяцінстве ён акампаніраваў Ларысе Александроўскай. У музычным тэхнікуме скончыў клас фартэпіяна ў Якава Жыва. У сваім выпуску лічыўся адным з самых яркіх піяністаў. У яго выпускной праграме былі саната Бетховена «Аўрора», Дванаццатая венгерская рапсодыя Ліста, эцюды Шапэна...

Плюс яшчэ падзарабляў тапёрам... Што дадало артыстычнасці. Адна з яго вучаніц, Людміла Шаламенцава, успамінала: *«З намі ён быў артыстам, гэта таксама яго асаблівасць. Мы ведалі, што ў юнацтве, каб зарабіць грошы на вучобу, ён працаваў тапёрам, агучваў фільмы, і памятаю, як выдатна ён іграў полькі, вальсы, калі мы бывалі ў яго на дні нараджэння... Міхаіл Аркадзевіч іграў, а мы танцавалі».*

### «Ці ты не галодны?»

Калі вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі, ужо на другім курсе яму прапанавалі даць канцэрт у Ленінградскай філармоніі. Вядома,тамтэйшае інтэлектуальнае і мастацкае жыццё зачароўвала... Бергер пазнаёміўся з Пракоф'евым, Маякоўскім... Мог застацца ў Ленінградзе, дзе скончыў аспірантуру, але абраў родны Мінск. У 1937-м Камітэт мастацтваў адправіў яго выкладчыкам у мінскую кансерваторыю, а ў верасні 1938-га ён быў прызначаны яе дырэктарам.

Часы нялёгкія, многія з маладых музыкантаў недаядалі... Міхаіл Бергер заўсёды пытаўся, ці не галодны вучань, ці не пазычыць грошай на ежу. А яшчэ, як сцвярджаюць сведкі, не баяўся залічваць у студэнты дзяцей рэпрэсіраванай інтэлігенцыі. А такіх было шмат. І згаданыя Уладзімір Жылка і Язэп Пушча апынуліся далёка ад дому, у высылцы.

Да вайны кансерваторыя знаходзілася ў будынку на Кірава. Па ўспамінах калегі Бергера, піяніста Рыгора Шаршэўскага, *«Чалавек ён быў добры, высакародны... Гэты чарнявы, усмешлівы, маладжавы музыкант імчаў па лесвіцах зверху ўніз — як быццам храматычныя гамы 32-ма нотамі іграў, толькі нагамі паспяваў перабіраць. Многія імкнуліся спарадзіраваць яго, але не ва ўсіх атрымлівалася, тут трэба было мець тэхніку высокага класа».*

### «Песня яшчэ не скончылася, а дывізія ўжо ўзнялася і рушыла на абарону нашай Радзімы»

Вялікая Айчынная змяніла ўсё... Першая франтавая канцэртная брыгада ўтварылася ў Гомелі. Першае выступленне адбылося 3 ліпеня 1941 года, на лясной паляне, для толькі што мабілізаваных чырвонаармейцаў. А потым пачалася цяжкая, небяспечная, самаадданая праца — па тры-чатыры канцэрты на дзень, якія нярэдка перарываліся бамбёжкамі. Вось што згадваў Міхаіл Бергер пра адзін з такіх канцэртаў:

*«Жнівень 1941 года. Узброеныя да зубоў нямецкія вандалы ўварваліся на тэрыторыю Беларусі, Украіны. Амаль уся Беларусь — Мінск, Бабруйск, Віцебск, Магілёў — занятая ворагам. І толькі тут, каля сцен Гомеля, ён марна б'ецца вось ужо некалькі месяцаў... Гомель стаў для фашыстаў беларускім Вердэнам. Для ўмацавання горада прыбыла грузінская дывізія, якая чакала загад аб наступленні. Байцы сталіліся ад шматдзённых пераходаў і доўгага шляху з Закаўказля ў Беларусь. Перад боем трэба было іх неяк натхніць.*

*І вось тады перад дывізіяй з'явілася Вераніка Барысенка. Яна стаяла на адчыненым кузаве грузавіка каля фартэпіяна. На вялізнай лясной паляне ўсталявалася цішыня. Цудоўная артыстка спявала рамансы і песні. Магчыма, не ўсе творы байцы зразумелі, але дух займала — так хораша было ад сачыненняў, якія выконвала Вераніка Барысенка! У яе голасе былі і жаночая пакута, і хітрасць, і ўладнасць, міжволі хацелася ёй падпарадкавацца...*

*Гукі фартэпіяна расталі. Некалькі імгненняў доўжылася цішыня. Потым паляна загула, у паветра паляцелі пілоткі:*

*— Ваша, ваша! Брава, брава! — доўга не змаўкалі захопленыя воклічы.*

*Канцэрт меў вялізны поспех. Памятаю, да мяне падышоў палкоўнік і папрасіў выканаць грузінскую песню «Суліко». І ўсе мы пачалі спяваць яе, але да камандзіра падышоў ардынарац і штосьці яму прашаптаў. Песня яшчэ не скончылася, а дывізія ўжо ўзнялася і рушыла на абарону нашай Радзімы».*

На фартэпіяна падчас канцэрта іграў менавіта Міхаіл Бергер. А згаданая ва ўспамінах Вераніка Барысенка — студэнтка II курса Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Яна прыехала ў родны Гомель на канікулы, калі пачалася вайна. І сталася так, што дырэктар кансерваторыі Міхаіл Бергер выступаў у франтавой брыгадзе са сваімі студэнтамі — акрамя Барысенкі, у брыгаду ўключылі студэнта-вакаліста Юрыя Матраева.

### Радыё, фартэпіяна, кансерваторыя

Чытаем далей аўтабіяграфію Міхаіла Бергера:

*«С первых дней войны я по поручению ЦК КП(б)Б организовал фронтовую бригаду, в которой пробыл по октябрь 1941 г., в качестве пианиста и худ. руководителя. В первых числах января 1942 года поступил в госпиталь № 45-59, где лечился и работал как пом. полит. В июне 1942 года комитетом искусств т. Солодовниковым назначен директором филармонии в гор. Самарканде... в феврале 1943 г. направляюсь в Саратов для сбора Белорусской госуд. консерватории.*

*В сентябре 1943 года ЦК КП(б)Б вызывает меня в Москву и назначает начальником музык. отдела радиовещания БССР. После чего я направляюсь в район Новобелица Гомельской области, по освобождению Минска с Радиокомитетом переехал в Минск».*

Міхаіл Бергер адзначае, што ўвесь гэты час выступаў як саліст-піяніст, а ў кансерваторыю вярнуўся ў якасці прафесара і загадчыка кафедры, бо «за время моей работы в радиокомитете был назначен другой директор консерватории».

Пад аўтабіяграфіяй, колькі можна разабраць размазаны атрамант, значыцца лістапад 1948 г. Пад другой аўтабіяграфіяй — умоўная дата, пазначаная архівістамі: «1940-я — 1950-я гг». Яна больш кароткая, змест прыблізна супадае.

Вось даведка на бланку Беларускай дзяржаўнай эстрады ад 15.08.1941 г. за подпісам дырэктара Прагіна і начальніка Бабруйскага Дома Чырвонай Арміі Каратквевіча:

*«Дана настоящая тов. Бергеру М.А., что он с 1.07.41 г. работал по обслуживанию концертами Действующей Красной Армии в качестве пианиста и художественного руководителя, в связи с окончанием работы направляется в город Новосибирск».*

Наступны дакумент — ад 14.09.1941 г.:

*«Удостоверение.*

*Выдано настоящее участникам концертной бригады по обслуживанию частей действующей армии Западного фронта т.т. Любану И.И. и Бергеру М.А. в том, что они действительно следуют за получением задания в комитет по делам искусства в г. Москву».*

І некалькі слоў пра студэнтаў Бегнера. Калі ў верасні канцэртную брыгаду адправілі ў распараджэнне Галоўнага палітупраўлення, Барысенка і Матраеў аднавілі заняткі ў кансерваторыі. Пасля вызвалення Беларусі Юрый Матраеў шмат гадоў быў салістам Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, Вераніка Барысенка стала вядучай салісткай Вялікага тэатра ў Маскве, дзе працавала больш за 30 гадоў. Вядомая спявачка Тамара Сіняўская гаварыла пра яе: *«Это был голос, который можно держать в ладони — такой плотный, очень красивый, мягкий, но в то же время упругий. Красота этого голоса в том, что он — солнечный, несмотря на то, что мецо-сопрано... У Борисенко в голосе все... есть: день и ночь, дождь и солнце...»*

### Два браўнінгі

Працытуем яшчэ адзін дакумент з фондаў архіва-музея, напісаны атрамантам на пажаўцелым кавалачку аркуша з вучнёўскага сшытка ў лінейку:

*«Удостоверение*

*Выдано настоящее члену концертной бригады по обслуживанию воинских частей действующей армии тов. Бергеру М.А. в том, что ему выдан браунинг № 278777».*

Пад тэкстам дата: «22 июля 1941 года г. Гомель».

Гэты браўнінг згадваюць многія сведкі... Уражваючыся відовішчам, як мяккі, інтэлігентны Міхаіл Бергер не расставаўся з даверанай зброяй нідзе. Вось урывак з успамінаў аднаго з артыстаў:

*«Пробовал свои силы в композиции заслуженный артист БССР М. Бергер. Юрий Матраев пел его лирическую песенку «Портной». Бергер участвовал в самых трудных поездках бригады, в том числе — в части комкора Л.Г.Петровского, сражавшейся за Рогачев и Жлобин. Михаил Аркадьевич носил в кармане пистолет «ТТ», тщательно обернутый в носовой платок».*

Дарэчы, звярнулі ўвагу на тэму песні — гэта безумоўна асабістае, успамін пра бацьку-краўца.

Але настала мірнае жыццё... Вось яшчэ адзін дакумент, гэтым разам — на адмысловым бланку, на паперы, якая нават праз паўвека не пажаўцела:

*«Управление милиции МВД БССР*

*Гор. Минск, 11 октября 1949 г.*
*Квитанция №201.*
*Принято от гр. Бергер Михаила Ароновича, прожив. по ул. Герцена д. № 2 кв. № 23 следующее оружие:*
*Род — пистолет*
*Система — Браунинг*
*№ 43661*
*Калибр 7,65».*

Патронаў да пісталета не было. Але гэта не значыла, што маэстра дарэшты разброіўся. Вось яшчэ адна падобная квітанцыя, ужо ад 13 мая 1950 г.

*«Квитанция №135*
*Принято от гр. Бергера Михаила Ароновича, проживающего по ул. Советская, дом № 183 кв. № 80 следующее оружие:*
*Род — пистолет*
*Система — браунинг*
*№ 22734*
*Калибр 6,35 мм*
*Патроны 10 (десять)».*

Франтавікі, дарэчы, неахвотна расставаліся са сваёй баявой зброяй. Дачка паэта Аркадзя Кулешова Валянціна ўспамінала, як яе бацька разам з іншымі пісьменнікамі-франтавікамі, калі адзначалі Дзень Перамогі, выходзілі ноччу на двор і пулялі ў неба, салютавалі.

Дарэчы, звярнулі ўвагу, што нумары здадзенай зброі не адпавядаюць таму, першаму браўнінгу, выдадзенаму ў 1941-м. Мо нумар яго памянялі, а мо быў у маэстра трэці браўнінг, магчыма, здадзены раней?

### «Міша, Грыша і Ірыша»

Пасля вайны кансерваторыя месцілася ў былым Доме губернатара на плошчы Свабоды, разам з музычнай школай і Саюзам кампазітараў. Педагогам давялося працаваць і жыць там жа. Адрас, які значыцца ў квітанцыі аб здачы браўнінга Міхаілам Бергерам у 1949-м, Герцэна, 2, і ёсць той самы адрас. У 1958-м быў узведзены будынак, у якім знаходзіцца сучасная Акадэмія музыкі, па праекце архітэктара Рамана Гегарта.

У 1966 годзе Міхаіл Бергер узначаліў у кансерваторыі кафедру канцэртмайстарскага майстэрства. У студэнтаў тады існаваў жарт пра «Мішу, Грышу і Ірышу» — у кансерваторыі выкладалі тры выдатныя фартэпіянныя педагогі Міхаіл Бергер, Рыгор Шаршэўскі і Ірына Цвятаева..

Вядомая піяністка і педагог Людміла Шаламенцава трапіла да Міхаіла Бергера ў дзесяцігадовым узросце. *«Я ўбачыла ў класе за раялем вельмі прыгожага чалавека, ён прыняў мяне быццам у бацькоўскія рукі. Гэты чалавек на ўсё жыццё стаў для мяне ўзорам і прыкладам.*

*Вучыў смела, ярка. Ён меў не надта моцнае здароўе, але мы ніколі не адчувалі, што займаемся ў педагога, які можа быць стомлены. Ён быў вельмі патрабавальны да сябе, і нам даводзілася цягнуцца за ім».*

Як адзначалі многія, Бергер вучыў так, каб яго вучні таксама ў свой час мелі патрэбу і ўменне перадаць сваё майстэрства наступнаму пакаленню... Сын Міхаіла Бергера — таксама вядомы піяніст і педагог. А Людміла Шаламенцава была настаўніцай выдатнага беларускага піяніста Юрыя Блінова. «Школа Бергера» — казала яна.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14.
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### 30 сентября 2022 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2022 год | 2021 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 75 186 | 39 452 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 529 687 | 505 022 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 280 276 | 197 634 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 166 314 | 174 893 |
